Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Нядзеля 27 сакавіка 1938 г., № 17 (359).

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ГЕНІЙ РУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

70 год таму назад руская зямля ўзбагаціла чалавецтва неўміручым геніем, слаўным майстрам культуры—Аляксеем Максімавічам Горкім. У вобразе Аляксея Максімавіча Горкага ўвасоблены благароднейшыя і найбольш высокія рысы рускага чалавека: яго таленавітасць, свабодалюб'е, працавітасць, бясстрашша, чэснасць і прамата, нянавісць да ўсялякага крывадушша, прадажнасці, двурушніцтва.

Масцеравы малярнага цэха Аляксей Пешкоў узняўся да самых вышынь чалавечай культуры. У гэтым мы бачым сімвал высокай адаронасці нашага народа, яго маральнай чыстаты і велічы.

Жыццёвы шлях Максіма Горкага быў поўны пакут. Дзіцянём ён паспытаў ужо ўсе жахі капіталістычнай эксплаатацыі, зведаў усю цемру і беспрасветную імглу, якая панавала над краінай. Горкі абышоў усю рускую зямлю, ён ведаў дасканала пакуты свайго народа, гэта дало яму сілу ступіць на шлях барацьбы за вызваленне свайго народа, гэта дало яму магчымасць стварыць геніяльныя творы мастацкай літаратуры.

Горкі, з'яўляючыся прадаўжальнікам вялікіх традыцый рускіх класікаў — Пушкіна, Гогаля, Талстога, адначасова ўнёс у літаратуру зусім новыя якасці, якіх да яго не ведала літаратура.

Горкі — вялікі пісьменнік пралетарыята. Горкі прадчуваў вялікі рэволюцыйны выбух, які наступіў у 1905 годзе. Яго бессмяротны «Буравеснік» і «Песня аб сокале» — гэта гімн перадавому чалавеку, які не баіцца смерці і смела ідзе біцца за лепшае шчаслівае жыццё.

Калі Горкі ўсклікнуў: «Хай мацней ударыць бура» — дык гэта быў і заклік да рэволюцыйнай барацьбы і прадчуванне немінучасці рэволюцыйнага выступлення народа.

Горкі ў далейшым першы ў сусветнай літаратуры з геніяльнай сілай паказаў сям'ю рэволюцыянера-рабочага, рэволюцыйную барацьбу рабочага класа. Яго раман «Маці» — неўміручы помнік гэтай барацьбы, а вобразы Нілаўны і Паўла ўвайшлі ў галерэю сусветных літаратурных вобразаў.

Горкі з выключнай сілай паказаў паражэнне і смерць у рускіх умовах капіталіста, купца-жывадзёра, а таксама рост іх антыпода-рабочага. Такія вобразы, як Артамонаў, Булычоў, Фама Гардзееў, з'яўляюцца вобразамі класічнымі.

З асаблівай нянавісцю маляваў Горкі вобразы мяшчан, а яго славуты «Гарадок Окураў» стаў нарыцальным імем для характарыстыкі мяшчанскіх закуткаў. Горкі з усёй сілай уласцівага яму майстэрства намаляваў вобразы прадажнай інтэлігенцыі ў рамане «Жыццё Кліма Самгіна».

Горкі сваімі публіцыстычнымі творамі дапамагаў партыі Леніна—Сталіна ў згуртаванні кадраў інтэлігенцыі як у нашай краіне, так і за мяжою — вакол вялікага і неперамажнага сцяга Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Будучы непахісным змагаром за сталінскую палітыку, за пабудову соцыялізма ў нашай краіне, за росквіт соцыялістычнай культуры ў Совецкім Саюзе, Горкі нястомна выхоўваў і беражна расціў пісьменніцкія кадры. Гэту работу ён пачаў яшчэ задоўга да Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Усе буйнейшыя таленты совецкай літаратуры прайшлі праз горкаўскую школу выхавання.

Горкі першы змог ацаніць тую магутную сілу, якую тоіць у сабе мудрая творчасць народа. Сам чэрпаючы з гэтай багацейшай крыніцы, ён заклікаў усю совецкую літаратуру вучыцца на ўзорах народнай творчасці. Аляксей Максімавіч пісаў:

«Я звяртаю вашу ўвагу... на той факт, што найбольш глыбокія і яркія мастацка-дасканалыя тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю працоўнага народа».

Усякі геніяльны чалавек іменна тым і геніяльны, што круг яго інтарэсаў бязмежны, і колькі-б адзначэнняў яму ні даваць, нельга вычарпаць усе тыя галіны чалавечай дзейнасці і культуры, якія маюць да яго дачыненне.

Горкі вялікі гуманіст... Горкі і зарубежная інтэлігенцыя... Горкі і сусветная літаратура... Горкі і дзеці, Горкі і яго клопаты пра народных мастакоў і пісьменнікаў, Горкі журналіст, Горкі рэдактар... Усе гэтыя і безліч іншых вялікіх тэм вынікаюць з выдатнай дзейнасці тытана культуры. Нарэшце, клопаты нашага незабыўнага Максімыча пра росквіт культуры і літаратуры раней забітых і прыгнечаных народаў.

Беларускі народ і яго літаратура будуць свята ў сваім сэрцы захоўваць вобраз нашага вялікага Горкага, які ў дні беспрасветнага гнёту заўважыў маладую тады беларускую літаратуру і даў высокую ацэнку яе двум выдатным дзеячам — Янку Купалу і Якубу Коласу. Будучы сам чыстым і цвёрдым у сваіх перакананнях, як алмаз, Горкі ўсёй сваёй душой ненавідзеў усялякае двурушніцтва, крывадушша, здраду, усялякае паніжэнне чалавечай годнасці, якая «гучала для яго горда».

Вось чаму ён з такой сілай выступаў супроць тройчы праклятых трацкісцка-бухарынскіх вырадкаў, гэтай сумесі «лісы і воўка», вось чаму ён з такой нянавісцю гаварыў аб варварах XX века — аб гітлераўскіх карычневых мярзаўцах.

Аляксей Максімавіч Горкі, вялікі мастак, які ў сваіх творах геніяльна паказаў пакуты народа пад уладай цара, памешчыкаў і буржуазіі, не мог прайсці міма вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў, якія пад кіраўніцтвам рабочага класа, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна змагаліся за сваё вызваленне. Іменна гэта назаўсёды звязала Аляксея Максімавіча з нашай большэвіцкай партыяй, са змаганнем рабочага класа. Гэта звязала Аляксея Максімавіча непарыўнай і сардэчнай дружбай з геніямі і правадырамі народаў В. І. Леніным і І. В. Сталіным. Нямала дапамог Аляксей Максімавіч большэвіцкай партыі ў годы падполля, нямала адказных і баявых партыйных заданняў вынес ён на сваіх плячах.

Лічачы Горкага буйнейшым мастаком слова, які «прынёс і прынясе шмат карысці сусветнаму пралетарскаму руху», В. І. Ленін праяўляў выключныя клопаты аб Аляксею Максімавічу, з дня ў дзень на працягу дзесяцігоддзяў сачыў за развіццём яго творчасці, за станам яго здароўя.

Гэта асабістая дружба вялікага правадыра працоўных з вялікім мастаком слова перайшла ў дружбу прадаўжальніка ленінскай справы— І. В. Сталіна з Аляксеем Максімавічам. Аляксей Максімавіч быў верным і непахісным змагаром за сталінскую палітыку, верным другам нашага правадыра, беззаветным змагаром за перамогу соцыялізма, будаўніком соцыялістычнай культуры. Голас Горкага ў абарону дэмакратыі і прагрэсу і супроць крывавага фашызма быў чутны на ўвесь свет. Голас Горкага, накіраваны супроць трацкісцка-бухарынскіх бандытаў і паслугачоў фашызма, гучаў як смяротны прыгавор гэтым азвярэлым псам.

Вось чаму трацкісцка-бухарынскія вырадкі з такой лютай нянавісцю тачылі свае акрываўленыя нажы на мудрага і бясстрашнага нашага Максімыча.

Шляхам подлых здрад і вераломства яны дабраліся да дарагога ўсяму свету вялікага палымнеючага сэрца Горкага і ўмярцвілі яго.

Совецкі народ жахнуўся, калі даведаўся пра гэтую подлую чорную здраду. Ён адплаціў бандытам па заслугах. Бруднай крывёй сваёй заплацілі вырадкі фашызма за сваё нечуванае злачынства. Імёны забойцаў вялікага Горкага, як сімвал ганьбы і подласці, з праклящцем будуць называцца наступнымі пакаленнямі. Яны будуць прыбіты да ганебнага слупа навекі. А імя Горкага, як палымнеючае сэрца Данко, будзе асвятляць наступным пакаленням шляхі да іх вызвалення, будзе бессмяротным увасабленнем чыстаты, прыгожасці і благародства, пераможным клічам да ўрачыстасці комунізма на ўсім свеце.

Мы запомнім, якое прыгожае жыццё пражыў гэты тытан чалавечай мыслі, мы запомнім усё, што ён зрабіў для сусветнай культуры, сэрца Горкага неўміруча будзе стукаць у нашых уласных сэрцах і клікаць да помсты, да знішчэння крывавых гітлераўскіх фашысцкіх псоў, якіх так ненавідзеў Горкі.

Смерць Горкага была цяжкой утратай, «пасля Леніна... самай цяжкой утратай для нашай краіны і для чалавецтва» (В. М. Молатаў).

Каб не подлая чорная здрада трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, умярцвіўшых Горкага, мы-б яшчэ маглі, магчыма, прывітаць жывога Горкага з 70-годдзем з дня нараджэння.

Сэрца крывёю абліваецца ў кожнага сумленнага грамадзяніна нашай краіны, калі ён думае, што з прычыны нечуванай мерзасці халопаў капітала Горкага няма сярод нас.

У дзень 70-годдзя з дня нараджэння Горкага ўсе народы нашай радзімы з яшчэ большай вастрынёй адчуваюць неперамажную праўду горкаўскіх слоў: «Калі вораг не здаецца,—яго знішчаюць». Народы нашай радзімы глыбока ў сэрцы сваім захаваюць благароднае аблічча вялікага гуманіста, непараўнанага мастака слова Максіма Горкага.

Няхай жыве неўміручая творчасць вялікага мастака слова—Горкага!

Няхай жыве ў вяках яго бессмяротная слава!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна, выхаваўшая на шчасце і радасць працоўным і на страх іх ворагам геніяльны талент Максіма Горкага!



І. В. Сталін і А. М. Горкі на Краснай плошчы ў 1931 годзе.

Белсаюзфота.

Ніхто з буйных пісьменнікаў нашай краіны, ды і ў іншых краінах, не ведаў так блізка жыцця «нізоў» народа пры капіталізме. Ніхто з іх не перажыў на сабе самім столькі жорсткасці і гнуснасці з боку паноў-эксплаататараў. Ніхто з іх нават проста не бачыў сваімі вачамі столькі закатаваных паднявольнай працай і забітых гнётам капітала, як наш Горкі, у якога ўсё гэта выкавала непрымірымасць і рэволюцыйную нянавісць да капіталістычнага ладу і баззаветную веру ў вызваленчую сілу комунізма.

Вось чаму рабочыя і ўсе працоўныя бачаць у Горкім СЯБЕ, СВАЙГО чалавека, СВАЁ жыццё-лёс, СВАЮ будучыню. Вось чаму Горкага так любілі, любяць і будуць любіць працоўныя нашай краіны і працоўныя іншых краін.

... Горкі — ГЕНІЯЛЬНЫ МАСТАК СЛОВА.

... Горкі — ВЯЛІКІ СЫН ВЯЛІКАГА НАРОДА.

... Горкі — БЕЗЗАВЕТНЫ ДРУГ ПРАЦОУНЫХ І НАТХНІЦЕЛЬ БАРАЦЬБЫ ЗА КОМУНІЗМ.

... Пасьля Леніна смерць Горкага— самая цяжкая ўтрата для нашай краіны і для чалавецтва.

(З прамовы тав. В. М. МОЛАТАВА на жалобным мітынгу, прысвечаным памяці А. М. Горкага 21 чэрвеня 1936 года).

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОУНАГА СОВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ПЕРСАНАЛА ДРЭЙФУЮЧАЙ СТАНЦЫІ «ПАУНОЧНЫ ПОЛЮС»

1. За праяўлены гераізм у справе выканання ўрадавага задання прысвоіць званне Героя Совецкага Саюза, з уручэннем ордэна Леніна:

Крэнкелю Эрнсту Тэадоравічу — радысту дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс».

Шыршову Пятру Пятровічу — навуковаму работніку дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс».

Фёдараву Еўгенію Канстанцінавічу — навуковаму работніку дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс».

2. Узнагарадзіць другім ордэнам Леніна Героя Совецкага Саюза тав. **Папаніна** Івана Дзмітрыевіча — начальніка дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс».

3. Выдаць тт. Папаніну І. Д., Крэнкелю Э. Т., Шыршову П. П. і Фёдараву Е. К. грашовую ўзнагароду ў памеры 30 тысяч рублёў кожнаму.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 22. III. 1938.

***

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за дасканалае выкананне ўрадавага задання па зняццю персаналу дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс» узнагароджан ордэнамі СССР экіпаж і экспедыцыйны склад суднаў «Таймыр», «Мурман», «Мурманец» і «Ермак».

Ордэнам Леніна ўзнагароджана 15 чалавек, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — 31 чалавек. Усім ім выдадзена таксама грашовая ўзнагарода.

Аб утварэнні Камітэта па справах кінематаграфіі пры Соўнаркоме СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў у мэтах паляпшэння і аб'яднання кіраўніцтва кінематаграфіяй, упарадкавання справы кінофікацыі, вытворчасці і пракату кінофільмаў утварыць пры Соўнаркоме СССР Камітэт па справах кінематаграфіі.

На Камітэт па справах кінематаграфіі пры Совеце Народных Камісараў СССР ускладзена кіраўніцтва ўсімі справамі кінематаграфіі, у тым ліку кіраўніцтва вытворчасцю кінокарцін, кінофікацыяй і пракатам кінокарцін па ўсяму СССР.

Пры Соўнаркомах саюзных і аўтаномных рэспублік і пры краявых і абласных выканаўчых камітэтах утвараюцца кіраўніцтвы кінофікацыі, як органы Камітэта па справах кінематаграфіі.

Упраўленне кінофікацыі пры Соўнаркоме РСФСР ліквідуецца. Яго функцыі ўскладзены на Камітэт па справах кінематаграфіі пры Совеце Народных Камісараў СССР.

Пры Камітэце па справах кінематаграфіі вырашана стварыць Совет з удзелам прадстаўнікоў саюзных рэспублік. На Совет ускладзены задачы разгляду агульных і тэматычных планаў вытворчасці кінокарцін, кінофікацыі і пракату карцін, увязкі гэтых планаў з нацыянальнымі асаблівасцямі рэспублік.

***

Советам Народных Камісараў СССР прынята таксама пастанова аб паляпшэнні арганізацыі вытворчасці кінокарцін.

Совет Народных Камісараў СССР пастанавіў прызначыць тав. **Дукельскага** Сямёна Сямёнавіча старшынёй Камітэта па справах кінематаграфіі пры СНК СССР.

Узнагароджанне работнікаў кіно

У сувязі з выпускам выдатных кінофільмаў, якія атрымалі аднадушнае адабрэнне гледачоў, «Ленін у Кастрычніку», «Пётр Першы» і калгаснага фільма «Багатая нявеста» указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР узнагароджаны рэжысёры, сцэнарысты, артысты, мантажоры і рабочыя-стаханаўцы, стварыўшыя гэтыя фільмы.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны: Б. В. Шчукін — актор, які выконвае ролю В. І. Леніна ў фільме «Ленін у Кастрычніку», М. І. Ромм — рэжысёр фільма «Ленін у Кастрычніку», А. Я. Каплер — аўтар сцэнарыя фільма «Ленін у Кастрычніку», А. Н. Талстой — аўтар сцэнарыя фільма «Пётр Першы», В. М. Петроў — рэжысёр і суаўтар сцэнарыя фільма «Пётр Першы», Н. К. Сіманаў — актор, які выконвае ролю Пятра Першага, І. А. Пыр'еў — рэжысёр фільма «Багатая нявеста».

Ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга ўзнагароджаны: М. І. Жараў — актор, які выконвае ролю Меншыкава ў фільме «Пётр Першы. Н. К. Чэркасаў — актор, які выконвае ролю Аляксея ў фільме «Пётр Першы», Н. П. Охлопкаў — актор, які выконвае ролю Васіля ў фільме «Ленін у Кастрычніку», М. А. Ладыніна — артыстка, якая выконвае ролю «багатай нявесты», і інш.— усяго 10 чалавек.

Ордэнам «Знак Гонару» узнагароджаны: А. К. Тарасава — артыстка, якая выконвае ролю Екацерыны ў фільме «Пётр Першы», І. А. Любезнаў — актор, які выконвае ролю рахункавода ў карціне «Багатая нявеста», А. М. Дмахоўская — артыстка, якая выконвае ролю брыгадзіршы ў фільме «Багатая нявеста», А. Антонаў — артыст, які выконвае ролю брыгадзіра ў фільме «Багатая нявеста», і інш. — — усяго 8 чалавек.

5 чалавек узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета СССР.

ЗАВАЮЕМ НОВЫЯ ВЫШЫНІ МАСТАЦТВА!

Магутны рост эканомікі Совецкай Беларусі абумовіў росквіт культуры, усіх відаў мастацтва, літаратуры. Таварыш Сталін з геніяльнай празорлівасцю прадбачыў гэты рост, кажучы, што: «перыяд дыктатуры пролетарыята і будаўніцтва соцыялізма ў СССР ёсць перыяд **росквіту** нацыянальных культур, соцыялістычных па зместу і нацыянальных па форме».

Гераічны беларускі народ на аснове Сталінскай Канстытуцыі рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Падагуліўшы пройдзены шлях барацьбы і перамог у справе пабудовы соцыялізма, у справе стварэння культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу, рабочы клас, сялянства і інтэлігенцыя БССР, разам з усімі народамі Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пойдуць да далейшых перамог у справе пабудовы комунізма.

Беларускі народ па-праву ганарыцца сваімі дасягненнямі. Прамысловасць БССР у параўнанні з дарэволюцыйным часам вырасла ў дваццаць з лішнім разоў. Пабудаваны гіганты прамысловасці, абсталяваныя першакласнай тэхнікай. Выраслі новыя кадры рабочых. Наша вёска стала непазнавальнай. Сёння замест сахі, якая цяпер здадзена ў музей, працуюць трактары, камбайны ды іншыя складаныя сельска-гаспадарчыя машыны. Соцыялістычная сельская гаспадарка СССР ужо ў 1937 годзе дала каля сямі мільярдаў пудоў зярна. А галоўнае, выраслі людзі як у горадзе, так і ў вёсцы, якія цалкам і поўнасцю адданы вялікім ідэям Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, гатовы ў любы час аддаць усе свае сілы, а калі трэба і жыццё за справу соцыялізма.

Раней прыгнечаная, бяспраўная і ўбогая поўкалонія Расійскай імперыі Беларусь, у якой было каля 70 проц. непісьменных, цяпер стала квітнеючай рэспублікай. У Совецкай Беларусі цалкам ліквідавана непісьменнасць. БССР мае тысячы ніжэйшых школ, 75 спецыяльных сярэдніх вучылішчаў, 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, Акадэмію Навук.

Беларусь у мінулым і марыць не магла аб стварэнні свайго мастацтва. Гінулі дзесяткі тысяч таленавітых людзей, не знаходзячы прымянення сваім сілам і здольнасцям. І так ішло з пакалення ў пакаленне, — мыслячаму чалавеку не было месца на зямлі. Вялікая Соцыялістычная рэволюцыя ў СССР, якая разняволіла прыгнечаныя раней нацыянальнасці, прызвала іх да творчага жыцця.

Сабраны і выданы Акадэміяй навук БССР і Дзяржвыдавецтвам совецкі фальклор, — а гэта толькі пачатак работы, — з усёй нагляднасцю сведчыць аб выключных талентах, якімі багат наш народ. Цяпер не толькі ў БССР, але і далёка за яе межамі ведаюць аб створаных беларускім народам выключных па сваіх мастацкіх якасцях казках, легендах, песнях пра вялікіх правадыроў працоўных Леніна і Сталіна, як «Чалавек-сонца», «Ленінская праўда», «Дарожанька» ды шмат іншых, якія здзіўляюць яркасцю вобразаў, непасрэднасцю і сілай пачуцця.

На-днях Дзяржвыдавецтва выпусціла ў свет кніжку «Беларускія народныя і рэволюцыйныя песні». Хоць у зборнік увайшла і невялікая колькасць багатай народнай творчасці, ён уяўляе выключную цікавасць. Беларускі народ у песнях выказвае свае думы, любоў і адданасць комуністычнай партыі правадырам—Леніну і Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё.

Сёння ў Совецкай Беларусі — шэсць дзяржаўных драматычных тэатраў, пяць калгасна-соўгасных тэатраў, сотні драматычных, харавых і іншых самадзейных мастацкіх гурткоў, у якіх у вольны час удзельнічаюць тысячы людзей, ствараючы совецкае мастацтва.

Такія тэатры, як Менскі і Віцебскі Дзярждрамтэатры, ЯДТ БССР, — з'яўляюцца складанейшымі мастацкімі адзінкамі не толькі беларускага значэння. Яны ўяўляюць цікавасць і для саюзнай сцэны. Гэтыя тэатры настолькі выраслі, што мы ўправе ставіць перад імі высокія патрабаванні. Мінулы тэатральны год паказаў, што нашы тэатры ўсілах раскрыць творы геніяльнага пісьменніка А. М. Горкага, вялікага рускага драматурга А. Н. Остроўскага, стварыць высокаякасны совецкі спектакль.

За апошні год значна вырас і ўмацаваўся Рускі тэатр БССР, які з неакрэсленага перыферыйнага тэатра, якім ён быў у мінулым, вырастае ў цікавы рэспубліканскі тэатр. Вялікую работу праводзіць Дзяржаўны дзіцячы тэатр для свайго росту, як мастацкай адзінкі самастойнага значэння.

У БССР шырока разгорнута музыкальная асвета. Існуе цэлая сетка музыкальных школ, сярэдніх вучылішчаў на чале з Кансерваторыяй, Тэатр оперы і балета. Рад кампазітараў з поспехам працуе над стварэннем арыгінальнай оперы і балета. Усё гэта з'яўляецца паказальнікам росквіту беларускага совецкага мастацтва.

Дасягненні мастацтва БССР сапраўды велізарныя. Ніколі нельга забываць, таго факта, што мастацтва Совецкай Беларусі зусім маладое, што пачатак яго развіцця па сутнасці пачынаецца пасля Кастрычніцкай рэволюцыі. Тая нязначная колькасць самадзейных мастацкіх гурткоў, якія сям-там былі да рэволюцыі, мастацкага значэння не мелі. Гэта былі слабыя аматарскія гурткі і гаварыць аб іх мастацкай значымасці нельга.

Але дасягненні мастацтва БССР былі-б куды большымі, калі-б на фронце мастацтваў не арудавалі заклятыя ворагі народа—нацыянал-фашысты, трацкісты, правыя, бундаўцы, эсэры і іншая контррэволюцыйная брыда, якія ўсімі спосабамі імкнуліся сарваць стварэнне совецкага мастацтва. Яны шкодзілі як толькі маглі. Аб гэтым з цынічнай нахабнасцю прызнаўся на працэсе антысовецкага «права-трацкісцкага блока» адзін з «кіраўнікоў» беларускіх нацыянал-фашыстаў, агент польскай дэфензівы—Шаранговіч.

Нашай партыяй выхаваны таленавітыя кадры артыстаў, рэжысёраў, мастакоў, кампазітараў, драматургаў, якія цалкам адданы вялікай партыі Леніна—Сталіна.

І ўсё-ж, не гледзячы на велізарнейшы рост совецкага мастацтва БССР, мы значна адстаем у параўнанні з другімі братнімі рэспублікамі.

Перад мастацтвам БССР стаіць неадкладная задача стварыць такія спектаклі, оперы, кінокарціны і іншыя мастацкія творы, якія-б не сорамна было паказаць у Маскве совецкаму ўраду, вялікаму Сталіну, як дасягненне беларускага народа ў справе стварэння класічнага совецкага мастацтва. Для гэтага ў нас ёсць усе **мажлівасці**, сілы і сродкі. Але, каб ператварыць **мажлівасць** у **сапраўднасць**, патрэбна напружаная работа ўсяго мастацкага фронта БССР.

Велізарнейшая арганізуючая роля ў гэтай справе належыць друку і, у прыватнасці, газеце «Літаратура і мастацтва». Мы яшчэ не навучыліся па-большэвіцку паказваць нашы велізарнейшыя дасягненні на фронце мастацтва і па-большэвіцку крытыкаваць недахопы. А недахопы бясспрэчна ёсць і крытыкаваць іх трэба. Задаволіцца дасягнутым у галіне мастацтва мы не можам.

«Пастаянны рух наперад, пастаянны прагрэс ляжаць у прыродзе соцыялістычнага грамадства. Большэвікі непрымірыма адносяцца да адставання, застою, руціны. Прагрэс стаў уласцівасцю совецкага народа, кіруемага партыяй Леніна—Сталіна. Народ наш знаходзіцца ў пастаянным руху наперад, умацоўваючы магутнасць сваёй радзімы» («Правда»).

Вядучы тэатр БССР — Менскі Белдзяржрамтэатр уключыў у свой рэпертуар п'есу Н. Пагодзіна «Чалавек з ружжом», у якой выведзен вобраз генія пролетарскай рэволюцыі В. І. Леніна. Абкружым калектыў тэатра і актора, на якога выпадзе гонар працаваць над роллю В. І. Леніна, клопатамі, дапамагаючы тэатру ў справе стварэння гэтага спектакля.

Рад нашых паэтаў і пісьменнікаў — П. Броўка, Е. Рамановіч, П. Глебка, кампазітараў — Е. Цікоцкі, А. Багатыроў, М. Крошнер працуюць над арыгінальнай операй і балетам. Наша задача, задача ўсёй совецкай грамадскасці ўсямерна дапамагчы ім у гэтай складанай, надзвычай адказнай і важнай творчай рабоце.

Перад беларускімі совецкімі драматургамі стаіць пачэсная задача напісання п'есы аб стварэнні БССР і аб выключнай ролі ў гэтай справе І. В. Сталіна, аб рабоце ў КП(б)Б і велізарнейшай дапамозе беларускаму народу саратнікаў вялікага Сталіна, таварышоў Н. І. Ежова, Л. М. Кагановіча, М. В. Фрунзе, Г. К. Орджанікідзе, аб сваім дэпутаце ў Вярхоўны Совет СССР К. Е. Варашылаве.

Згуртаваўшыся яшчэ шчыльней навакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта, працаўнікі мастацтва БССР пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, ліквідуючы вынікі шкодніцтва на фронце мастацтваў, створаць вышэйшае па сваёй якасці соцыялістычнае мастацтва.

Завоюем новыя вышыні мастацтва!

З ВЯЛІКАЙ РАДАСЦЮ АДДАЮ УСЕ СВАЕ СІЛЫ НАШАЙ РАДЗІМЕ

Дзякую партыю, урад СССР за высокую ўзнагароду совецкаму пісьменніку. Я адчуваю ўсю адказнасць, якую ордэн Леніна накладвае на мяне, і з вялікай радасцю аддаю ўсе мае сілы нашай радзіме і нашай вялікай гістарычнай справе.

АЛЯКСЕЙ ТАЛСТОЙ.

ВЯЛІКІ ПРОЛЕТАРСКІ ПІСЬМЕННІК-БАЕЦ

Семдзесят год назад — 28 сакавіка 1868 года ў сям'і ніжагародскага абойшчыка Максіма Пешкова нарадзіўся сын Аляксей. Праз тры дзесяцігоддзі наша краіна ўжо ведала Аляксея Пешкова, як буйнейшага пролетарскага пісьменніка, страснага рэволюцыянера, натхнёнага буравесніка першай рускай рэволюцыі.

У Горкім рана абудзілася ненасытная прага ведаў, воля да барацьбы за права на чалавечае жыццё. Улетку 1884 года шаснаццацігадовы юнак пакідае Ніжні-Ноўгарад і ад'язджае ў Казань вучыцца. Без сродкаў для жыцця, начуючы ў трушчобах, юнак спрабуе рыхтавацца ў сельскія настаўнікі. Упарта змагаючыся за сваё існаванне, Аляксей Максімавіч працуе то дворнікам, то садоўнікам, то падручным пекара ў булачнай, то харыстам у тэатры. У Казані Горкі збліжаецца з рэволюцыйнымі студэнцкімі і рабочымі гурткамі, упершыню знаёміцца з марксізмам. Ен чытае тут Чэрнышэўскага, Пісарэва, Адама Сміта і «Капітал» Маркса, а ў 1888 годзе ад'язджае ў сяло Краснавідава для рэволюцыйнай прапаганды сярод сялян.

Затым зноў ідзе паласа вандраванняў, калі Горкі працуе то на рыбалоўных промыслах Каспія, то начным вартаўніком, наглядчыкам і вагаўшчыком на чыгунцы. Улетку 1889 года Горкі вяртаецца ў Ніжні-Ноўгарад. У кастрычніку таго-ж года яго арыштоўваюць і ён месяц сядзіць у турме.

Надыходзіць вясна 1891 года. Горкі зноў ідзе вандраваць па Расіі, ахоплены страсным жаданнем даведацца, самому пабачыць, як жыве народ, якія сілы ён тоіць у сабе, што думае пра сваё жыццё. Прайшоўшы ўздоўж Волгі да Царыцына, па Украіне, Крыму і Каўказу, ён глыбокай восенню прышоў у Тбілісі. Год, пражыты ў Тбілісі, стаў знамянальным у жыцці пісьменніка. Тут ён, служачы ў чыгуначных майстэрнях, блізка сышоўся з рабочай моладдзю, утварыў з некалькімі таварышамі прапагандысцкі гурток, наладжваў чыткі і гутаркі.

У верасні 1892 года ў тбіліскай газеце «Кавказ» было надрукавана апавяданне Горкага «Макар Чудра» — дзівосная рамантычная легенда пра людзей, якія палічылі лепш памерці, чым жыць у рабстве.

Вялікі пісьменнік прайшоў вялікі жыццёвы шлях. У гады маленства і юнасці ён на сабе адчуў жорсткі гнёт буржуазна-памешчыцкай Расіі, навучыўся ненавідзець царства паліцэйскага бота і чыноўніцкага праізволу. Нягледзячы на ўсе цяжкія выпрабаванні, юнак, загартаваны і ўпарты, выйшаў на шырокую дарогу літаратурнай і грамадскай дзейнасці.

Літаратурная вядомасць Горкага хутка расце. На старонках газет Паволжжа, а затым у сталічных газетах і журналах паяўляюцца ўсё новыя і новыя яго творы. Пераехаўшы ў Пецербург, Горкі ў сакавіку 1901 года ўдзельнічае ў дэманстрацыі ля Казанскага сабора. Неўзабаве журнал «Жизнь» друкуе цудоўную «Песню пра буравесніка», якая прагучала як прадвяшчальнік надыходзячай рэволюцыйнай буры.

Гэтак-жа, як і «Песня пра сокала», яна была насычана сапраўднай рэволюцыйнай рамантыкай. Яркія вобразы гэтых твораў былі бязмежна ясны і зразумелы найшырэйшым колам чытачоў. Рэволюцыйная рамантыка не перашкаджала, а, наадварот, дапамагала Горкаму вывучаць рэчаіснасць, адлюстроўваць яе ў сваіх бліскучых творах.

Папулярнасць Горкага сярод рэволюцыйнай моладзі і рабочых была на той час такой вялікай, што царскі ўрад пачаў шукаць спосабы «абясшкодзіць» пісьменніка: ён быў арыштаван па абвінавачанню ў друкаванні рэволюцыйных адозваў да сормаўскіх рабочых, а затым выслан у Арзамас пад нагляд паліцыі. Гэта не зламіла Горкага. Творчыя сілы б'юць у ім крыніцай.

У 1902 годзе на сцэне Маскоўскага Мастацкага тэатра ставяцца горкаўскія п'есы «Мяшчане» і «На дне», якія маюць выключны поспех.

Царскі ўрад усяляк праследуе Горкага за яго літаратурна-грамадскую дзейнасць. Калі ў лютым 1902 года Горкі быў абран ганаровым акадэмікам па разраду мастацкай славеснасці, выбары, па патрабаванню Нікалая II, былі ануліраваны. Гэты выпад царскага ўрада супроць выдатнага пісьменніка выклікаў абурэнне сярод перадавой інтэлігенцыі. Караленка і Чэхаў у сувязі з гэтым дэманстрацыйна адмовіліся ад звання ганаровага акадэміка.

Вярнуўшыся з ссылкі ў сталіцу, Горкі ў 1902 годзе наладжвае арганізацыйныя сувязі з рэволюцыйнай соцыял-дэмакратыяй, з яе органам «Искрой», якой кіраваў В. І. Ленін. Усе наступныя годы Аляксей Максімавіч прымае актыўны ўдзел у рэволюцыйнай барацьбе. Ен ідзе ў рэволюцыю рука ў руку з большэвікамі, выступае са справаздачай — праклямацыяй аб падзеях 9 студзеня 1905 года, заклікае ўсіх да «неадкладнай упартай і дружнай барацьбы з самаўладствам». Горкі дапамагае ўзбраенню рэволюцыі ў часе снежаньскага паўстання ў Маскве, едзе па даручэнню партыі большэвікоў у Амерыку для збірання грошай на карысць рэволюцыі. Там ён стварае адзін з сваіх буйнейшых твораў — аповесць «Маці» — гімн рэволюцыйнаму падполлю і большэвіцкай партыі. Гэта выдатная кніга атрымала высокую ацэнку В. І. Леніна, які сказаў пра яе: «Кніга — патрэбная, багата рабочых удзельнічала ў рэволюцыйным руху несвядома, стыхійна, і цяпер яны прачытаюць «Маці» з вялікай карысцю для сябе. Вельмі своечасовая кніга».

Перайшоўшы ў 1906 годзе на становішча палітычнага эмігранта і пасяліўшыся ў Італіі на востраве Капры, Горкі прадаўжае работу над новымі творамі. Паяўляюцца яго славутыя аповесці «Гарадок Окураў» і «Жыццё Матвея Кажэмякіна», якія малююць «павятовую» мяшчанскую Расію ва ўсёй яе страшэннай аголенасці. Горкі піша «Казкі аб Італіі», частка якіх была надрукавана ў «Звезде» і атрымала высокую ацэнку Леніна.

У маі 1907 года Горкі ўдзельнічае на Лонданскім з'ездзе РСДРП, як дэлегат з дарадчым голасам. У студзені 1908 года завязваецца рэгулярная перапіска паміж ім і В. І. Леніным, які высока цаніў асобу і талент Горкага, імкнуўся шчыльней звязаць яго з партыяй.

У 1913 годзе Горкі рэдагуе белетрыстычны аддзел у большэвіцкім журнале «Просвещение». У снежні 1913 года Горкі вяртаецца ў Расію, пачынае згуртоўваць вакол сябе маладыя пролетарскія літаратурныя сілы. Да моманту звароту ў Расію Горкі заканчвае работу над аўтабіяграфічнай аповесцю «Маленства». Пасля, калі былі створаны «У людзях» і «Мае універсітэты», гэтыя творы склалі незвычайную эпапею чалавека, які сілаю сваёй волі і велізарнай настойлівасцю перамог усе перашкоды, з якімі ён сутыкаўся ў невыносных умовах жыцця ў царскай Расіі.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя вызваліла народы царскай Расіі, паклала пачатак цудоўнага, свабоднага жыцця для працоўных, за права на якое нястомна змагаўся Горкі.

У 1918 годзе ён горача ўключаецца ў культурнае будаўніцтва маладой Совецкай рэспублікі. У 1921 годзе па патрабаванню Леніна Горкі едзе лячыцца за-граніцу, дзе знаходзіцца да 1928 года. У гэты перыяд ён стварае рад новых мастацкіх твораў — «Мае універсітэты», «Справа Артамонавых», першыя кнігі рамана «Жыццё Кліма Самгіна», рэзка выступае ў замежным друку супроць агіднейшых нападак белаэмігрантаў на Совецкую краіну.

Прыехаўшы ў 1928 годзе, да свайго 60-годдзя, у СССР, Горкі, як сапраўдны рэволюцыянер-баец, як вялікі пісьменнік пролетарыята, са ўсёй сілай свайго велізарнага таленту страсна ўключаецца ў соцыялістычнае будаўніцтва. Гэты перыяд яго літаратурна-грамадскай дзейнасці адзначан стварэннем буйных драматычных твораў — «Егор Булычоў і другія», «Васіль Дасцігаеў і другія», новымі кнігамі рамана «Жыццё Кліма Самгіна». Да гэтага часу адносяцца яго шматлікія бліскучыя публіцыстычныя выступленні, кожнае слова ў якіх гучала моцным заклікам да барацьбы за справу рабочага класа, за перамогу комунізма.

У 1930 годзе, у дні, калі ішоў працэс «Прампартыі», калі перад судом рабочых і сялян прадсталі ўдзельнікі контррэволюцыйнай змовы супроць совецкай улады, лакеі разгромленых і выкінутых за рубяжы краіны расійскіх фабрыкантаў і заводчыкаў, агенты міжнароднага імперыялізма, — Горкі выступіў з гнеўным артыкулам «Калі вораг не здаецца, — яго знішчаюць». Вялікі пісьменнік сучаснасці пісаў:

«Унутры краіны супроць нас хітрэйшыя ворагі арганізоўваюць харчовы голад, кулакі тэрарызуюць сялян-калектывістаў забойствамі, падпаламі, рознымі подласцямі, — супроць нас усё, што аджыло свае тэрміны, адведзеныя яму гісторыяй, і гэта дае нам права лічыць сябе ўсё яшчэ ў становішчы грамадзянскай вайны. Адсюль следуе натуральны вывад: калі вораг не здаецца, — яго знішчаюць.

Звонку супроць творчай работы Саюза советаў — еўрапейскі капітал. Ен таксама аджыў свой тэрмін і асуджан на пагібель. Але ён усё яшчэ жадае і ўсё яшчэ мае сілы супраціўляцца немінучаму. Ен звязан з тымі здраднікамі, якія шкодзяць унутры Саюза, і яны, па меры сваёй подласці, дапамагаюць яго намерам разбойніка».

Ва ўсе наступныя годы свайго цудоўнага жыцця Аляксей Максімавіч заняты кіпучай грамадска-палітычнай дзейнасцю. Багата часу і сіл ён аддаў згуртаванню совецкіх пісьменнікаў, росквіту совецкай літаратуры, вартай нашай вялікай эпохі, барацьбе з ворагамі народа ў літаратуры, з ворагамі, якіх ён ненавідзеў і якімі пагарджаў як мастак і грамадзянін.



Л. Н. Талстой і А. М. Горкі ў Яснай Паляне ў 1900 годзе.
Белсаюзфота.

Горкаму належыць ініцыятыва стварэння «Истории гражданской войны» і «Истории фабрик и заводов», на старонках якіх адлюстравана жыццё і гераічная барацьба працоўных нашай краіны. Горкі заўсёды знаходзіў час для работы з маладымі аўтарамі, аддаваў багата ўвагі навуцы, горача любіў дзяцей — новае пакаленне грамадзян нашай вялікай радзімы.

Уладзімір Ільіч Ленін яшчэ ў 1909 годзе пісаў аб тым, што Горкі «моцна звязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго свету». Шчыльна звязаны з рэволюцыйным пролетарыятам і яго авангардам — большэвіцкай партыяй, Горкі выступаў супроць растучай ваеннай небяспекі, гнеўна нападаў на падпальшчыкаў вайны, зрываў маскі з ворагаў, выкрываючы крывавыя замыслы фашызма, нястомна змагаўся з усімі ворагамі народа.

У 1932 годзе ў сваім звароце да ўдзельнікаў Антываеннага кангрэса ў Амстэрдаме Горкі заклікаў пролетарыят і інтэлігенцыю ўсяго свету «прыкласці ўсе сілы, усю сваю магутнасць для арганізацыі апошняга і рашучага бою супроць класавага ворага, разбураючага культуру, створаную векавымі патугамі работнікаў фізічнай і разумовай працы». З такім-жа гарачым заклікам звярнуўся ён у 1935 годзе да Міжнароднага кангрэса пісьменнікаў на абарону культуры, які адбываўся ў Парыжы.

Пасля зладзейскага забойства трацкісцка-бухарынскімі бандытамі страснага трыбуна рэволюцыі Сяргея Міронавіча Кірава Горкі пісаў:

«Вось — мярзаўцы забілі Сяргея Кірава, аднаго з лепшых правадыроў партыі, узорнага работніка ў справе адраджэння пролетарыята і сялянства да новага жыцця, да будаўніцтва соцыялістычнага грамадства, забілі простага, яснага, непахісна цвёрдага, забілі за тое, што ён быў іменна такім добрым — і страшным для ворагаў».

Горкі ніколі не пераставаў напамінаць аб будучай ваеннай небяспецы, аб немінучасці смяротнай схваткі двух светаў—соцыялістычнага і капіталістычнага.

Вялікі баец свайго класа, Горкі жыў і тварыў «на радасць усім працоўным, на страх ворагам рабочага класа» (Сталін). Горкі, вялікі совецкі патрыёт, горача любіў усім сваім велізарным сэрцам радзіму і народы СССР, з радасцю гаварыў аб гістарычных перамогах краіны соцыялізма, аб новай соцыялістычнай культуры. «Усё, што створана ў Саюзе Соцыялістычных Совецкіх Рэспублік, — створана ў тэрмін менш двух дзесяткаў год, і гэта красамоўней за ўсё гаворыць аб даравітасці народаў Саюза, аб іх працоўным гераізме, аб тым, што ў нашай краіне праца становіцца мастацтвам, аб тым, што пролетарыят Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, кіруемы вучэннем і партыяй Леніна і невычарпальнай, усё растучай энергіяй Іосіфа Сталіна, стварае новую культуру, новую гісторыю працоўнага чалавецтва».

Горкі неаднаразова падкрэсліваў, што совецкі народ валодае дзівоснай зброяй. «Наша зброя не толькі ў руках байцоў разумнай, выдатнай Чырвонай Арміі, — указваў ён у сваім адказе ткачысе Трохгорнай мануфактуры Е. І. Сямёнавай, — яна ў мудрым, выратоўчым для ўсяго свету вучэнні Леніна — Сталіна...».

Совецкі народ гарачай любоўю акружыў вартага свайго сына, блізкага друга і саратніка Леніна і Сталіна. Усё прагрэсіўнае чалавецтва чула прыслухоўвалася да бясстрашных і мудрых слоў Горкага. Ворагі баяліся яго і ненавідзелі.

Больш трох дзесяцігоддзяў назад, калі голас Буравесніка першай рускай рэволюцыі прадсказваў надыходзячую буру, раз'юшаная чорная сотня спрабавала прыпыніць біццё агністага сэрца Горкага. Аднойчы, у часе прагулкі па беразе Волгі каля Ніжняга-Ноўгарада на Горкага напаў падасланы забойца і двойчы ўдарыў яму нажом у сэрца. Нож трапіў у капавы партсігар і прабіў яго. Толькі срэбраная лілея, якая ўпрыгожвала партсігар, выратавала жыццё вялікага пісьменніка.

Сваю зброю накіравалі ў сэрца Горкага тройчы праэрэнныя ворагі народа, злобныя наймiты замежных разведак, гнусныя і брудныя шакалы фашызма, страціўшыя чалавечае аблічча. Усе сумленныя працаўнікі земнага шара здрыгануліся, даведаўшыся аб небывалым у гісторыі чалавецтва злачынстве, аб зверскім усмерчанні Горкага.

Працэс антысовецкага «права-трацкісцкага блока» паказаў усяму свету наёмных фашысцкіх забойцаў Горкага, спайманых і выкрытых слаўнымі работнікамі совецкай разведкі, кіруемай сталінскім наркомам тав. Н. І. Ежовым. Ворагі народа, якія рыхтавалі ўзброеную інтэрвенцыю супроць Совецкага Саюза, якія распрадавалі па кавалках свяшчэнную совецкую зямлю, рабілі замах на жыццё кіраўнікоў партыі і ўрада, у першую чаргу на жыццё таварыша Сталіна. Адным з бліжэйшых сяброў вялікага правадыра народаў быў Горкі. Свае лапы, абагроныя крывёю Менжынскага, Кірава і Куйбышэва, ворагі працягнулі да Горкага, каб спыніць яго палаючае сэрца. Па нацкаванню гнуснейшага пса фашысцкіх разведак Іуды Троцкага шпіёны і забойцы — бухарыны, рыкавы, ягоды — рукамі злачынца—урача Левіна ўсмерцілі любімага сына Аляксея Максімавіча — Максіма Пешкова, а затым з іезуіцкім каварствам і хітрасцю абарвалі даражэйшае жыццё адважнага рэволюцыянера — байца, вялікага пісьменніка-гуманіста, непахіснага сталінца Горкага.

Бязмернай была жалоба працоўных, якую ў дзень пахавання А. М. Горкага выказаў на жалобным мітынгу тав. В. М. Молатаў:

«Пасля Леніна смерць Горкага — самая цяжкая страта для нашай краіны і для чалавецтва».

Гнеў напоўніў сэрцы ўсіх сумленных працаўнікоў свету, калі было выкрыта нечуванае злачынства. Воляй совецкага народа фашысцкія шпіёны і забойцы знішчаны.

У апошнія дні свайго жыцця, абарванага ворагамі народа, Горкі з хваляваннем і радасцю сустрэў праект новай Сталінскай Канстытуцыі.

«Радасна жыць і змагацца ў краіне, дзе вялікая мудрасць партыі і жалезная воля яе правадыра Іосіфа Сталіна назаўсёды вызваляе чалавека ад праклятых звычак і забабонаў мінулага» — пісаў Горкі — бясстрашны змагар за справу комунізма.

Мары вялікага пісьменніка ўжо ажыццявіліся ў нашай краіне, народы якой ідуць наперад да комунізма пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, увасобіўшай самыя смелыя мары лепшых прадстаўнікоў працоўнага чалавецтва. Як каштоўны алмаз і вастрэйшую зброю захоўвае совецкі народ багацейшую літаратурную спадчыну Горкага.

М. Ларчанка

Горкі і беларуская літаратура

Аляксей Максімавіч Горкі быў вялікім пісьменнікам-інтэрнацыяналістам, адданым другам працоўных усіх нацыянальнасцей. Ен цікавіўся жыццём і літаратурай народаў, якія да Вялікай пролетарскай рэволюцыі знаходзіліся ў каланіяльным рабстве, пад гнётам царызма.

Беларускі народ і яго літаратура многім абавязаны А. М. Горкаму. Ен быў першым вялікім рускім пісьменнікам, які яшчэ ў змрочныя годы царызма звярнуў увагу на прыгнечаны царызмам беларускі народ і яго маладую літаратуру.

У 1911 годзе Горкі пісаў: «Я звяртаю ўвагу скептыкаў на маладую літаратуру беларусоў — самага з... тага народа ў Расіі». І тут-жа для ўзору Аляксей Максімавіч пераклаў на рускую мову верш Янкі Купалы «А хто там ідзе» і даў гэтаму вершу надзвычай высокую ацэнку. Ен называе яго «суровай і красамоўнай песняй», якая «можа быць на час стане народным гімнам беларусоў».

Ужо гэты факт сведчыць аб тым, што Горкі з вялікай сімпатыяй і сардэчным спачуваннем адносіўся да жыцця беларускага народа і яго літаратуры яшчэ ў той час, калі працоўныя масы Беларусі знаходзіліся пад страшэнным соцыяльным і нацыянальным прыгнётам. І тады Горкі вітаў нацыянальна-вызваленчы рух беларускага народа, які мастацка адлюстраваны ў дакастрычніцкай творчасці нашых народных паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа.

У 1911 годзе Аляксей Максімавіч Горкі, цікавячыся пісьменнікамі, што выйшлі з народных нізоў, першы прыкмеціў і па-сапраўднаму ацаніў мастацкія таленты нашых народных паэтаў.

А. М. Горкі ў «Пісьмах да Кацюбінскага» так пісаў аб творчасці нашых, у той час яшчэ маладых, паэтаў: «...У Беларусі ёсць два паэты: Я. Колас, Я. Купала... Так.. проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым-бы крыху гэтых якасцей». («Новый Мир», 1928, № 1, стар. 187).

У гэтым выказванні Горкага дадзена глыбокая і правільная ацэнка мастацкай сутнасці дарэволюцыйнай творчасці нашых народных паэтаў. У рэволюцыйна-дэмакратычнай дакастрычніцкай лірыцы Я. Коласа і Я. Купалы мы знаходзім горкаўскія матывы і горкаўскую рэволюцыйную сімволіку.

У Горкага вобразы мора, буры, буравесніка — гэта сімвалы Вялікай пролетарскай рэволюцыі, сімвалы, якія гучаць «дивной музыкой откровения» і «зажигают безумной жаждой свободы, света» («Песня аб сокале»).

Горкаўскі вобраз буры, як сімвал рэволюцыі, адпаведным чынам выкарыстоўваўся Я. Коласам і Я. Купалам. У мастацкіх адносінах ёсць агульнае паміж пачатковымі радкамі «Песні аб буравесніку» Горкага і пачаткам верша Коласа «Арол». Калі ў Горкага пачынаецца так: «Над седой равниной моря ветер тучи собирает», а «между тучами и морем гордо реет Буревестник», то ў Коласа верш пачынаецца наступнымі словамі: «Над смужнай раўнінай высока-высока разняў свае крыллі арол адзінокі і вокам празорным ён даль азірае і гучныя крыкі над полем раняе».

Тут ёсць штосьці агульнае паміж горкаўскай сімвалічнай карцінай і коласаўскай рамантычнай зарысоўкай.

У дарэволюцыйных вершах Я. Коласа «Будзе навальніца» і «Перад бураю» даецца вобраз буры, як сімвал рэволюцыі, які вельмі блізкі да горкаўскай рэволюцыйнай сімволікі, нават выразы асобных радкоў і іх эмацыянальная афарбоўка напамінаюць асобныя выразы з «Песні аб буравесніку». Напрыклад, верш «Перад бураю» заканчваецца наступнымі радкамі: «Бо замыслілі штось хмары... ой, знаць бура загудзе!», а апошняя страфа верша «Будзе навальніца» гучыць так:

На небасхіле зарніцы мігцяць,
Громам узрушана грозная раць.
Мрок насядае глыбей і цяжэй,
Грымні-ж ты, бура, ды грымні дужэй!

Гэты сімвалічны вобраз гучыць па-горкаўску, а апошні радок верша амаль цалкам паўтарае словы «Буравесніка: «Пусть сильнее грянет буря!». Тое-ж самае мы маем і ў вершы Я. Купалы «Перад бурай» (1907), дзе паэт, паказваючы непамерныя пакуты прыгнечанага народа, дае сімвалічны вобраз рэволюцыі, якая наспявае і якая абавязкова прыдзе. Купала з упэўненасцю гаворыць аб гэтым:

На небе збіраецца хмура за хмурай,
І гром загрохача і дрогне свет цэлы.

Мы прывялі больш характэрныя прыклады таго, як Горкі яшчэ сваёй ранняй творчасцю ўздзейнічаў на маладую дарэволюцыйную літаратуру беларускага народа.

Горкі і пасля Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі аж да самых апошніх дзён свайго жыцця горача цікавіўся развіццём беларускай культуры і літаратуры. Калі А. М. Горкі быў выбран ганаровым членам Акадэміі навук БССР, ён у 1932 годзе напісаў спецыяльнае пісьмо на імя апошняй, у якім чотка акрэсліў асаблівасці і значэнне нашай Акадэміі і соцыялістычнай літаратуры народаў Совецкай Беларусі. Ен пісаў: «Беларуская Акадэмія навук служыць цэнтрам яднання беларускай, польскай, яўрэйскай, а таксама латышскай і літоўскай пролетарскай літаратур, якія ў сваім развіцці абапіраюцца на дасягненні братняй культуры рускай і інш. нацыянальнасцей Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік».

«Нацыянальная па форме, — прадаўжае А. М. Горкі, — соцыялістычная па мэтанакіраванасці і зместу культура беларусоў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў развіваецца на рубяжы двух светаў, на мяжы з фашысцкай Польшчай... Там, за мяжою бязлітасна прыдушваецца ўсякае праяўленне руху да волі, да развіцця нацыянальна-культурнай свядомасці, там адбываецца гвалтоўная паланізацыя народаў. У Беларусі забяспечана свабода культурнага росту ўсім яе нацыянальнасцям. З'яўляючыся фарпостам Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, Беларусь з'яўляецца крыніцай культурна-рэволюцыйнай энергіі, што цячэ на Захад у працоўныя масы».

І з гэтага мы можам бачыць, якую вялікую ўвагу ўдзяляў А. М. Горкі справе развіцця беларускай соцыялістычнай культуры і літаратуры.

Ен аказваў вялікі ўплыў і на развіццё совецкай беларускай літаратуры. Рэволюцыйная рамантыка Горкага плённа ўздзейнічала на беларускага совецкага пісьменніка Міхася Лынькова, які ў сваіх ранніх апавяданнях вучыўся мастацкаму майстэрству ў Горкага. У ранніх апавяданнях Міхася Лынькова і асабліва ў апавяданні «Над Бугам» ёсць штосьці горкаўскае ў паказе вобразаў і зарысоўках пейзажу. Так, экспазіцыя навелы «Над Бугам» нагадвае некаторымі сваімі момантамі экспазіцыю навелы «Чэлкаш» Горкага. У горкаўскім апавяданні між Чэлкашом і Гаўрылам адбываецца «маленькая драма» «на пустынным беразе мора», якое то спакойна, то бурна б'е сваімі хвалямі аб берагі. У Лынькова таксама адбываецца «невялічкая драма» Ванькі Разанскага і Ваські Шкетава на раздольным беразе Буга, дзе «пад лазнякамі чуеш прыдушаныя ўсплёскі вады».

Прыгадаем пейзаж гавані ў Горкага, дзе ўсе гукі зліваюцца «в оглушительную музыку трудового дня, и, мятежно колыхаясь, стоят низко в небе над гаванью — к ним вздымаются с земли все новые и новые волны звуков — то глухие, рокочущие, они сурово сотрясают все кругом, то резкие, гремящие — рвут пыльный, знойный воздух». А вось рамантычная зарысоўка ў Лынькова, якая перш за ўсё гучыць па-горкаўску музычна і рамантычна: «І, абуджаючы лясы і цёмнае неба, узняўся і нібы зашалясцеў у паветры магутны рокат, усё сільней і сільней запальваючы мора агню і над морам вогненым замітусіліся ў карагодзе шалёным цудоўныя іскры. Закіпела вада наўкола, ўскалыхнуліся масткі зыбучыя, вадзяныя пырскі змяшаліся з свінцовымі віхрамі. Штосьці вялікае прасвірчэла з гарачым звонам у паветры, бухала недзе блізка і ўзвілася вада ў агнявы клубок, які разляцеўся вадзянымі і сталёвымі пырскамі».

Характарыстыка вобраза Ваські Шкетава нагадвае горкаўскую манеру характарыстыкі вобраза Чэлкаша, а вобраз Ванькі Разанскага нагадвае вобраз горкаўскага Гаўрылы. Так, у Горкага Чэлкаш у наступным плане падаецца: «Он вспомнил прошлое, забывая править лодкой, повернутой волнением и плывшей куда то в море... а перед Челкашом быстро неслись картины прошлого, далекого прошлого, отдаленного от настоящей жизни целой стеной из одиннадцати лет босяцкой жизни. Он успел посмотреть себя ребенком, свою деревню, свою мать..., видел себя женихом и видел жену, черноглазую Анфису, с длинной косой, полную, мягкую, веселую»...

У такім-жа плане будуе і Міхась Лынькоў свой вобраз Ваські: «І ўспамінаецца Ваську не жыццё, а нейкае непаразуменне — быў палкухарам, быў і чалавекам у тракціры, потым неяк здарылася — захляснула Ваську жыццё цёмнай хваляй. І куды ні кінь на жыццёвыя сцежкі мінулыя, на іх толькі боўтаюцца кішэні павыразаныя, павыціснутыя шыбы акон, клумкі бялізны крадзенай, цёмныя сінякі пад вачмі і пабітыя рукі, пабітыя ногі. Праўда, успамінаецца яшчэ тоўстая Манька, якая дарыла любоў за пяць пятакоў».

З гэтых прыкладаў мы бачым, што ў мастацкіх адносінах майстэрству экспазіцыі навелы, характарыстыкі вобразаў М. Лынькоў вучыўся і вучыцца ў класіка соцыялістычнай літаратуры А. М. Горкага.

З'яўляючыся старшынёй Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР, Горкі вельмі клапаціўся аб развіцці ўсіх нацыянальных літаратур прыгнечаных раней народаў, у прыватнасці аб развіцці і становішчы беларускай літаратуры. Па ініцыятыве Аляксея Максімавіча ў 1935 годзе быў праведзен спецыяльны пленум праўлення ССП СССР у сталіцы Совецкай Беларусі, на якім цэнтральнае месца займалі пытанні развіцця нацыянальных літаратур — беларускай, украінскай і башкірскай.

А. М. Горкі з'яўляўся лепшым і сардэчным другам беларускага народа і яго літаратуры; ён з'яўляўся і з'яўляецца самым любімым і папулярнейшым пісьменнікам сярод працоўных мас БССР. Зараз у Дзяржаўным выдавецтве БССР выходзіць поўны збор твораў А. М. Горкага на беларускай мове. Пераклады Горкага на беларускую мову ўзбагачаюць нашу літаратуру.

Нашы народныя паэты Я. Купала і Я. Колас у сваім некролагу на смерць Горкага далі надзвычайна трапную ацэнку значэння Горкага для беларускага народа і яго соцыялістычнай літаратуры.

«Ты памёр, дарагі Аляксей Максімавіч, — пісалі Я. Купала і Я. Колас, — але ты нязрыма жывеш з намі і будзеш заўсёды жыць як наш настаўнік, непахісна клікаўшы да руху наперад, да прагрэсу, да вяршынь ведаў, да ўдасканалення чалавечай асобы, да мастацкага ўвасаблення яе ў паэтычных вобразах, да барацьбы з пошласцю, з мяшчанствам. Ніколі не забудуць цябе прыгнечаныя народы, сёння вызваленыя і шчаслівыя, і, ў прыватнасці, беларускі народ, бо ты адзіны вялікі пісьменнік, які прызнаў права гэтага народа ў асобе першых песняроў яго гора і прыгнечання на развіццё яго мастацкай літаратуры. Вечная памяць табе, вялікі пісьменнік, наш правадыр і настаўнік. Ніколі не памрэ ў нашым сэрцы тваё магутнае і смелае аблічча чалавека і пісьменніка-грамадзяніна, які ўсё жыццё змагаўся за свабоднага і поўнакроўнага чалавека».

І сапраўды, Горкі быў вялікім настаўнікам для нашых народных паэтаў, для ўсёй беларускай літаратуры. Ен клапатліва вырошчваў нашу літаратуру, яе пісьменнікаў.

Бязмерна значэнне Горкага для развіцця ўсіх нацыянальных літаратур вялікага Совецкага Саюза. Трацкісцка-бухарынскія бандыты, умярцвіўшы Горкага, хацелі знішчыць расцвіўшую соцыялістычную культуру і літаратуру совецкага народа. Фашысцкія псы, подлыя лапы якіх вырвалі ў нас Горкага, злоўлены і знішчаны.

Аляксея Максімавіча Горкага зараз няма разам з намі, але яго справа неўміруча: яна жыве і будзе жыць вечна ў росквіце соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме культуры народаў вялікага Совецкага Саюза.

АЛЯКСЕЙ МАКСІМАВІЧ

Аляксей Максімавіч Горкі...

Хто з нас не ведаў яго, пачынаючы з далёкага маленства, са школьнай парты? Хто з нас не захапляўся залатой рамантыкай Чэлкашоў, Мальваў, Ізэргілей... А «Буравеснік» а «Песня пра сокала»,—гэтыя рэчы да рэвалюцыі былі своеасаблівымі сімваламі веры для ўсяго перадавога і сумленнага ў старой Расіі, іх напамяць ведалі рэвалюцыйны рабочы, рэвалюцыйны інтэлігент. А любімыя героі «Маці», а такія фундаментальныя творы, як «Справа Артамонавых», «Жыццё Кліма Самгіна» і рад іншых, якія здзіўляюць нас багатым веданнем жыцця, праўдзівым і глыбокім рэалізмам яго паказу, рэалізмам, зцэментаваным найвялікшай нянавісцю да ворагаў народа і сусветнага мяшчанства. Пачытайце «Жыццё непатрэбнага чалавека», «Жыццё Кліма Самгіна», пачытайце некаторыя іншыя творы, і вы ўбачыце правобразы ўсёй той гнуснай іудавай зграі, якая ўзняла свае брудныя рукі на родны народ, на совецкую дзяржаву, якая ўзняла свае брудныя крывавыя лапы на жыццё самога Аляксея Максімавіча.

Мы ведаем Горкага, як найвялікшага пісьменніка перамогшага пролетарыята, як адну з каласальных сіл рэвалюцыі, стварыўшай новы социялістычны свет, як сцяг баявой культуры бальшэвізма. Аляксей Максімавіч як пісьменнік з'яўляўся і з'яўляецца абсалютным аўтарытэтам для нас, для літаратараў. Яго геніяльнае майстэрства, любоў да жыцця і да чалавека—нашага чалавека, палымнеючая нянавісць да ворагаў, неразрыўнасць слова і справы, выключная энергія і працавітасць разам з шырокай ініцыятывай, — у якой толькі справе не быў застрэльшчыкам Аляксей Максімавіч: «История фабрик и заводов», «История гражданской войны», «Библиотека поэта», «День мира» і інш. і інш., — хіба не найлепшым прыкладам з'яўляецца для нас усё шчодрае жыццё Аляксея Максімавіча—вялікага пісьменніка і грамадзяніна.

У Аляксею Максімавічу, як у гіганцкім фокусе, асяроджвалася ўсё тое лепшае, што было народжана ў чалавеку ў перамагаючым руху Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі. І таму так горача любілі яго, любілі як геніяльнага мастака, любілі як чалавека і блізкага, роднага, справядлівага, надзвычай чулага і гуманнага, у найлепшым сэнсе гэтага слова, непрымірымага да ворагаў.

Сустрэцца з Горкім, адчуць фізічную блізкасць да яго — было найвялікшым для нас шчасцем. Для нас Горкі — можа, гэта і груба будзе сказана — быў своеасаблівай Меккай. Я памятаю, як ездзілі мы да яго ў госці ў 1934 годзе. Прызнацца, мы страшэнна хваляваліся перад тым, як прыехаць да яго на дачу ў Горкі пад Масквой. Самыя нават словы «Аляксей Максімавіч» нейкім чынам дысцыплінавалі нас, прымушалі падцягнуцца і вонкава і духоўна. Здавалася, прыедзеш да Аляксея Максімавіча, сустрэнешся з праніклівым позіркам яго вачэй, а ён паглядзіць на вас, сурова нахмурыць высокі лоб і скажа задуменна і сумна:

— Надобра, мае другі... Пішаце мала, няма тэмпаў у працы, адсталі, таварышы, адсталі...

І, няма чаго грэху таіць,—пабойваліся мы Аляксея Максімавіча, пабойваліся ў самым лепшым сэнсе гэтага слова. Гэта нават не боязнь, а пачуццё сына да любімага бацькі: як-бы не пакрыўдзіць любімага чалавека, як-бы зрабіць так, каб ён быў задаволены. І не сакрэт, што перад імем Аляксея Максімавіча растайвалі ўсякія групавыя інтарэсы, знікала ўся тая мышыная вазня, якую парадзілі ў літаратурных арганізацыях ворагі народа—авербахі, кіршоны і інш.

Усякім групаўшчыкам і наогул адмоўным людзям у літаратуры станавілася не па сабе ў прысутнасці Аляксея Максімавіча, ён бачыў іх наскрозь і бязлітасна бічаваў іх у розных артыкулах накшталт «Літаратурных забаў».

Аднак, мы адхіліліся крыху ад тэмы...

І вось мы прыехалі да Аляксея Максімавіча. На паляне густога бору, адкрытай к берагу Масква-ракі, ветліва сустрэў нас светлы каменны дом—дача Горкага. На ганак выйшаў сустракаць сам гаспадар. Некалькі яго цёплых ветлівых слоў— і нічога не застаецца ад усёй нашай параднай нацягненасці. Поўнапраўнымі членамі горкаўскай сям'і ўваходзім мы ў дом, гуляем з гаспадаром па яго садзе, любуемся яго любімымі дрэвамі, газонамі, захапляемся дзівоснымі відамі, што раскінуліся за ракой у бязмежжы лугоў і палёў. Жнівеньскі дзень пахучы і цёплы. Як ніколі шчодрае сонца. Як добра было ў той дзень быць разам з любімым пісьменнікам і чалавекам, прагна ўглядацца ў абрысы яго постаці, у жывы бляск горкаўскіх воч, у яго непаўторную ўсмешку, услухацца ў яго голас, такі мяккі і задушэўны, калі гаворыць ён аб нашых совецкіх справах, непахісна цвёрды і гнеўны, калі гаворыць ён аб сучасных вандалах свету, аб фашызме, аб прагнасці сусветнага мяшчанства, аб перажытках старога ў нашым грамадстве і жыцці.

Аляксей Максімавіч сядзеў разам з намі, вялікі і разам з тым такі просты, глыбока чалавечны. Сустрэча з ім высока ўзнімала і акрыляла чалавека, ён быў найвялікшым настаўнікам. У захапляючай гутарцы ён гаварыў нам аб адносінах да ворагаў, у прыватнасці аб паказе кулацтва ў мастацкай літаратуры, Аляксей Максімавіч разгортваў перад намі найшырэйшыя перспектывы калектыўнай работы пісьменнікаў, распытваў аб нацыянальных літаратурах і наогул аб культурах братніх рэспублік. Мякка папракаў нас за своеасаблівую нерухомасць, за тое, што не ўдзяляем мы належнай увагі гісторыі сваіх народаў, гісторыі іх класавай барацьбы, геаграфіі і эканоміцы нашых рэспублік.

— Вось прыедзеш да вас, захочацца адразу-ж пазнаёміцца, а што за народ, а які гістарычны шлях прайшоў ён, а якая ў яго культура, а чым вылучаецца ён у братняй сям'і народаў... Тут-бы чалавеку ў рукі кніжачку належную, а яе вось і няма... А мы часам і не разумеем, як гэта вельмі і вельмі важна...

І тут агледзіць Аляксей Максімавіч уважлівым позіркам усіх прысутных, і цёплая ўсмешка пройдзе па яго твары, такая абнадзейваючая, натхняючая.

— Працаваць-жа вы можаце... Ведаю...

З выключнай цеплынёй адзываўся Аляксей Максімавіч аб нацыянальных літаратурах, гаварыў аб іх свежасці, шчырай непасрэднасці. Мякка ўказваў на недахопы, асноўным сродкам супроць якіх раіў вучобу.

У той дзень Аляксей Максімавіч багата яшчэ гаварыў аб узаемным вывучэнні братніх культур, аб больш шчыльным яднанні пісьменнікаў нашых рэспублік. Гаварыў аб драматургіі, аб «Усесаюзным тэатры», які, на яго думку, трэба заснаваць у Маскве, каб ставіць там творы нацыянальных драматургаў. Гаварыў аб неабходнасці заснавання штогодных альманахаў для публікавання лепшых узораў братніх літаратур. Вельмі захапляўся ён народнымі песнямі, якія спявалі госці, заклікаў да глыбокага вывучэння народнай творчасці, як невычэрпнай крыніцы творчага натхнення для любога з нашых пісьменнікаў.

Надзвычай цёпла развіталіся мы з Аляксеем Максімавічам. І ўвесь той дзень сустрэчы надоўга застанецца ў памяці кожнага з нас. Было такое ўражанне: нібы пабылі мы на найвялікшай горнай вяршыні, дзе так лёгка дыхаць, дзе такое чыстае, яснае сонца, адкуль так далёка відаць, адкуль усё жыццё раскрываецца ва ўсім неасяжным характве сваім, характве барацьбы і працы.

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

ГОРКІ—ДРАМАТУРГ

(Да пастаноўкі п'есы «Мяшчане» у Віцебскім драмтэатры)

Прачытаўшы першую п'есу Горкага «Мяшчане» (1901), А. П. Чэхаў заўважыў:

«Горкі павінен разбураць тое, што падлягае разбурэнню, у гэтым яго сіла і прызванне».

Горкім напісана семнаццаць п'ес — і з іх няма ні адной, у якой Горкага — драматурга захапілі-б спакойныя задачы простага жывапісання жыцця, простай зарысоўкі характараў і быту. Каго-б ні паказваў Горкі ў сваіх п'есах— ці тупых мяшчан—уласнікаў з правінцыяльнага захалусця («Мяшчане»), ці «высокакваліфікаваных» інтэлігентаў («Дзеці сонца»), басякоў («На дне»), ці купцоў «Егор Булычоў»),—ён не проста паказвае той ці іншы закавулак жыцця ён заўсёды паказваючы разбурае ва ўзнятым ім пласце жыцця тое, што «падлягае разбурэнню».

Толькі ў адной сваёй п'есе, у «Ворагах», Горкі ставіць непасрэдна тварам да твару два варожыя станы — рабочых і капіталістаў, і на гэтым прамым сутыкненні адкрытых ворагаў будуе сюжэт драмы. Але ў Горкага няма ні адной п'есы, дзе-б у той ці іншай форме драматург не быў заняты паслядоўным, страсным выкрыццём капіталізма.

Калі Горкі паказвае ў «Мяшчанах» змрочны, карэлы быт «бессеменаўшчыны», ён выкрывае смуродную, вязкую багну скупога і прагнага ўласніцтва. Калі ён паказвае «дно» з усімі жахамі апошняга забруджання і крайняга распаду чалавечай асобы, ён сваёй п'есай абвінавачвае капіталістычны лад у няспынным, масавым чалавеказабойстве. Калі Горкі прымушае Егора Булычова мітусіцца ў прадсмяротнай стоме і ўпэўніцца ў тым, што ўсе шляхі жыцця яму заказаны, драматург пераводзіць псіхалагічную драму паміраючага чалавека ў соцыяльную трагікамедыю паміраючага класа, смерць якога ёсць дабро для ўсяго чалавецтва.

Буржуазныя крытыкі абвінавачвалі Горкага — драматурга ў тым, што яго п'есы, быццам, пазбаўлены дзеяння і таму несцэнічны. Буржуазным крытыкам, а таксама нацыянал-фашыстам нізашто не хацелася прызнаць таго адзінага дзеяння, якім насычаны п'есы Горкага, таго, што ўсе яны пабудаваны на ўнутраным соцыяльным канфлікце, на жывой і страснай дзейнасці горкаўскага выкрыцця ворагаў жыцця — усіх гэтых Бессеменавых («Мяшчане»), Бардзіных («Ворагі»), Каламійцавых («Апошнія»), Жэлезновых («Васса Жэлезнова») і інш.

Забараняючы да пастаноўкі ў тэатрах п'есу «Ворагі», царскі цэнзар ставіў Горкаму ў віну не толькі тое, што «у гэтых сцэнах ярка падкрэсліваецца непрымірымая варожасць паміж рабочымі і работадаўцамі, прычым першыя паказваюцца стойкімі змагарамі, якія свядома ідуць да вызначанай мэты — да знішчэння капітала, апошнія-ж паказаны вузкімі эгаістамі», — цэнзар абвінавачваў Горкага яшчэ ў вялікім злачынстве: «Аўтар прадсказвае перамогу рабочых».

У «Мяшчанах» гэту перамогу прадсказвае Ніл: «Гаспадар той, хто працуе. Запамятайце-ка... гэта» — гаворыць ён Бессеменавым усіх рангаў, усіх краін.

Нават у змрочным «дне» раздаецца бадзёры і смелы голас: «хто незалежны і не чакае чужога, навошта таму хлусіць. Хлусня — рэлігія рабоў і гаспадароў. Праўда — бог свабоднага чалавека... чалавек — свабодны».

Але ніякія цэнзурныя вымаркі не змаглі знішчыць палкага рэвалюцыйнага закліку Горкага. Вымарваліся словы, але заставаліся пачуцці, прадаўжала жыць жывая думка Горкага, якая згуртоўвала сваім моцным цэментам яго п'есы. «Баявы тон, б'ючыя як хлыстом словы, рэволюцыйна насычаная падаплека п'есы» — вось што, па словах Вл. І. Неміровіча-Данчэнка, стварыла ў 1902 годзе, напярэдадні рэволюцыі, першы, ашаламляючы — і ў Расіі і за-граніцай — поспех п'есы «На дне».

Цэлы рад п'ес Горкага, зганьбаваных у старым тэатры воўчымі пашпартамі «несцэнічных», у тым ліку і «Мяшчане», атрымалі сапраўднае жыццё ў нашым, совецкім тэатры.

Адгукваючыся на патрэбы совецкага гледача, Горкі стварыў новы цыкл драматычных твораў. Адзін з іх — «Егор Булычоў і другія» склаў эпоху ў гісторыі совецкага тэатра.


«Мяшчане» ставяцца ў Віцебскім Беларускім драматычным тэатры рэжысёрамі Н. А. Віньярам і В. П. Тамарыным у плане соцыяльнага сутыкнення двух варожых станаў — закасцянелага, ўласніцкага мяшчанства і выйшаўшага на гістарычную арэну пролетарыята. На адным баку — мяшчане, Бессеменавы двух пакаленняў, з драпежніцтвам старых, з нікчэмнай пустатой маладога пакалення, з другога боку — машыніст Ніл з яго мужным імкненнем да соцыялістычнага будучага. Усім ходам п'есы, усім напорам яе вызваленчай думкі Горкі дае зразумець, што гэта будучае хутка стане сапраўднасцю.

Задача гэтага спектакля, які прысвечан 70-годдзю з дня нараджэння А. М. Горкага, — данесці да совецкага гледача цудоўную горкаўскую «Песню пра буравесніка», якая ў «Мяшчанах» гучыць з вялікай сілай.

С. ДУРЫЛІН.



«Апошнія» А. М. Горкага (Белдзярждрамтэатр). Люба — арт. Ермоліна, Соф'я — арт. Галіна, Каламійцаў — арт. Бірыла. «Фальшывая манета» А. М. Горкага (Яўрэйскі тэатр). Наташа — арт. Герцберг, Лузгін — арт. Трэпель.



Аляксей Максімавіч Горкі ў 1900 годзе.

Белсаюзфото.

ГОРКІ НА БЕЛАРУСКАЙ СЦЭНЕ

(Гутарка з рэжысёрам Белдзяржрдрамтэатра тав. М. А. Зоравым).

Ворагі народа, якія доўгі час шкодзілі на фронце мастацтва, спакваля і ўпарта распаўсюджвалі паклёпніцкія вымыслы аб тым, што п'есы найвялікшага пісьменніка і драматурга А. М. Горкага несцэнічны, не гучаць і г. д. Тэатрам БССР доўгі час не дазвалялі нават гаварыць аб п'есах Горкага.

Ненавідзячы ўсімі сіламі сваіх здрадніцкіх душонак лепшага друга працоўнага чалавецтва і вялікага Сталіна — Аляксея Максімавіча, ворагі народа, трацкісцка-бухарынскія шпіёны, дыверсанты і забойцы арганізавалі свайго роду байкот твораў Горкага, асабліва тых з іх, у якіх найбольш ярка адлюстраваны характэрныя рысы геніяльнага пісьменніка — вялікая любоў да працоўнага народа, глыбокая нянавісць да свету эксплаататараў і прыгняшальнікаў усіх масцей.

Калектыў Дзяржрамтэатра БССР даўно выказваў вострае жаданне ўключыць у свой рэпертуар п'есу А. М. Горкага. Але ворагі народа, якія арудвалі ў радзе кіруючых арганізацый БССР, глушылі малейшае жаданне калектыва ў гэтым напрамку.

Гэтым тлумачыцца той, на першы погляд, незразумелы факт, што ў рэпертуары Белдзяржтэатра (як і ў другіх тэатрах БССР) на працягу доўгага перыяду не было п'ес Горкага.

Пастаноўка п'есы «Апошнія» ў Белдзяржтэатры з'явілася, па сутнасці, першай пастаноўкай п'есы А. М. Горкага на беларускай сцэне.

Чаму тэатр спыніў свой выбар на п'есе «Апошнія»?

У гэтай п'есе Аляксей Максімавіч, паказваючы распад дваранскай сям'і, з вялікай сілай агаляе нікчэмнасць і агіднасць сышоўшых з гістарычнай арэны апошніх «магікан» класа эксплаататараў і тунеядцаў. Гэта п'еса давала магчымасць — шляхам раскрыцця вобразаў адной дваранскай сям'і — паказаць твар дарэволюцыйнай Расіі ва ўсёй яго непрыгляднасці.

Асноўная думка спектакля найбольш ярка выказана словамі аднаго з персанажаў п'есы—Любы:

«Мы ляжым на дарозе людзей, як абломкі нейкага старога цяжкога будынка, можа быць турмы. Мы валяемся ў пылу разбурэння і перашкаджаем людзям ісці».

Не гледзячы на адсутнасць сярод персанажаў п'есы «Апошнія» непасрэдных носьбітаў рэволюцыйнага дзеяння, у ёй выразна адчуваецца дыханне рэволюцыі.

Характэрна, што ў гэтым агідным свеце людзішак, якія прэтэндавалі на вядучую ролю ў гісторыі, прароцка выведзен геніяльным Горкім агідны вобраз турэмнага ўрача — дзялка, карысталюбца, чалавека духоўнага «дна»— Лешча, які ўсмерчвае заведама няправільным лячэннем свайго пацыента...

Аляксей Максімавіч добра ведаў подлае нутро класавага ворага, ведаў, на якія гнуснасці і агіднасці ён здолен у барацьбе за свае шкурныя інтарэсы.

Калектыў Дзяржрамтэатра з вялікім хваляваннем і пачуццём велізарнай адказнасці працаваў над п'есай Горкага. Працэс работы над п'есай, рэпетыцыі былі прасякнуты сапраўдным творчым уздымам. Калектыву хацелася з максімальнай дакладнасцю ўвасобіць на сцэне вобразы гэтага твора, як мага больш выразна данесці да гледача ідэю п'есы.

Цікавасць да гэтай работы нарастала ад рэпетыцыі да рэпетыцыі, бо п'есы Горкага з'яўляюцца невычарпальнай крыніцай творчасці актора.

Зразумела, зараз, праз год пасля выпуска спектакля «Апошнія» відаць, што можна было значна лепш і мацней зрабіць гэты спектакль. Аднак, і па сёнешні дзень работа над «Апошнімі» не спыняецца. Кожны ўдзельнік спектакля імкнецца знайсці найбольш правільныя, яркія рысы для сваёй ролі.

Нельга не сказаць аб той атмасферы прыўзнятасці, творчага ўздыму і сканцэнтраванасці, якія пануюць за кулісамі ў часе спектакля. Акторы любяць Горкага і часта гавораць, што драматургія Горкага з'яўляецца сапраўдным універсітэтам для актора і рэжысёра.

Зараз тэатр уключыў у свой рэпертуар адну з лепшых п'ес Горкага — жэмчужыну рускай драматургіі — «На дне». Яшчэ не вызначаны тэрміны пачатку работы, яшчэ не размеркаваны ролі, а калектыў тэатра праяўляе ўжо вялікую і прагную цікавасць да работы. Кожны актор тэатра палічыць за велізарнае шчасце і гонар для сябе прыняць удзел у рабоце над гэтым спектаклем.

Трэба сказаць, што да гэтага часу тэатры БССР зусім недастаткова знаёмяць нашага гледача з творамі найвялікшага пісьменніка і драматурга А. М. Горкага. Спектаклі Горкага, якія ўжо ідуць («Апошнія» у Белдзяржтэатры, «Фальшывая манета» у Яўрэйскім дзяржтэатры, «Дзеці сонца» у Рускім тэатры), сустракаюць захапляючы прыём у совецкага гледача.

Трэба ўзбагаціць рэпертуары нашых тэатраў п'есамі А. М. Горкага. Гэтага патрабуе і чакае ад нас совецкі глядач. Уключэнне ў рэпертуар нашых тэатраў на 1938 год толькі трох п'ес А. М. Горкага («Мяшчане» у Віцебскім тэатры, «На дне» — у Белдзяжтэатры і «Васса Железнова» ў Яўрэйскім дзяржтэатры) з'яўляецца яўна недастатковым.

Работа над п'есамі А. М. Горкага з'яўляецца адным з асноўных шляхоў далейшага росту і росквіту нашых тэатраў.

ТВОРЧАСЦЬ ГОРКАГА Ў ШКОЛЕ

Найвялікшы геній совецкай літаратуры і прадаўжальнік лепшых традыцый класікаў XIX стагоддзя А. М. Горкі пакінуў нам велізарную мастацкую спадчыну, на якой выхоўваюцца мільёны будаўнікоў соцыялізма. Неўміручыя творы вялікага пісьменніка, пачынальніка і найбольш выдатнага майстра соцыялістычнага рэалізма, маюць велізарны ўплыў на чытачоў.

Прадаўжаючы вялікія традыцыі крытычных рэалістаў XIX стагоддзя — Пушкіна, Гогаля, Салтыкова-Шчэдрына, Талстога і інш., Горкі змог з найбольшай глыбінёй пранікнуць у сучасную яму рэчаіснасць, адлюстраваць яе з выключным дарам аналізу, максімальнай нагляднасцю і пераканаўчасцю. Разам з тым геніяльны мастак аказаўся здольным, як ніхто з яго папярэднікаў, прадбачыць перспектыву, разглядзець контуры будучага, разабрацца ў шляхах, якія вядуць да знішчэння соцыяльнага зла, перабудовы грамадскага парадку ў інтарэсах працоўных.

Гэтыя якасці Горкаму надала арганічная непарыўная сувязь з пролетарыятам, мастаком і песняром вызваленчай барацьбы якога Аляксей Максімавіч стаў яшчэ у 90 годы мінулага стагоддзя. Ужо ў ранніх сваіх творах Горкі безагаворачна становіцца на пазіцыі рабочага класа, на якіх застаецца да апошніх дзён свайго кіпучага шматграннага жыцця.

Гаворачы аб велізарным ідэйна-мастацкім значэнні твораў Горкага і каласальнай сіле яго ўздзейнічання на чытачоў, неабходна вылучыць асобна наша падрастаючае пакаленне. Любімейшы пісьменнік совецкага народа з'яўляецца лепшым выхавальнікам чытаючай дзетвары. Можна без перапавелічэння сказаць, што з пісьменнікаў-класікаў Горкаму належыць буйнейшая роля ў фарміраванні светапогляду совецкага школьніка, падлетка, юнага грамадзяніна нашай краіны.

Знаёмячы чытаючую моладзь са змрочным мінулым нашай радзімы, жахлівым жыццём працоўных дарэволюцыйнай Расіі, творы Горкага вучаць ненавідзець сістэму капіталістычнага рабства, праізволу і прыгнечання. Супастаўленне кашмарных умоў працы і існавання мас, паказаных у горкаўскіх апавяданнях аб мінулым, з шчаслівым радасным жыццём совецкага народа ў сучасны момант дае магчымасць глыбей асведаміць велізарнасць нашых поспехаў і дасягненняў, заваяваных пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе геніяльнага правадыра І. В. Сталіна.

Як-жа прадстаўлена творчасць Горкага ў совецкай школе? Як і што засвойвае вучнёўская моладзь з твораў найвялікшага майстра слова, класіка соцыялістычнага рэалізма?

Раней за ўсё трэба падкрэсліць надзвычайную важнасць вывучэння біяграфічных вестак аб Горкім. Жыццё Горкага, поўнае вандраванняў, нястач, працоўных намаганняў, напружанай барацьбы за перамогу соцыялізма, з'яўляецца само па сабе ўдзячным матэрыялам, здольным аказаць на вучня велізарнае выхаваўчае ўздзейнічанне. Выкарыстоўваючы маючыя аўтабіяграфічны характар творы («В людях», «Мои университеты» і г. д.), настаўнікі абавязаны ў жывой і маляўнічай форме пазнаёміць дзяцей з жыццёвым шляхам Аляксея Максімавіча. Варта звярнуць асаблівую ўвагу на тое, як вучыўся Горкі, на непарыўную сувязь пісьменіка з рэволюцыйнай барацьбой рабочага класа і соцыялістычным будаўніцтвам, на дружбу яго з Леніным і Сталіным. Трэба прывесці вучням вядомыя водгукі Леніна аб Горкім, мастацкую творчасць якога Ільіч высока цаніў. Вось некаторыя з іх:

«Таварыш Горкі вельмі моцна звязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам усяго свету...» — піша Ленін у 1909 годзе (том XIV, стар. 211), абвяргаючы хлуслівыя весткі буржуазнага друку аб здбыўшымся нібы выключэнні Горкага з радоў соцыял - дэмакратычнай партыі.

«Няма сумнення, — піша Ленін у 1917 годзе, — што Горкі — велізарны мастацкі талент, які прынёс і прынясе шмат карысці сусветнаму пролетарскаму руху» (том XX, стар. 41).

У пятым класе сярэдняй школы вывучаюцца аповесці «Детство» і «В людях», якія знаёмяць з жыццём працоўнай дзетвары ў эксплаататарскім грамадстве. Перад вучнямі праходзяць жудасныя па сваёй жорсткай праўдзе старонкі, апавядаючыя аб цяжкім бессэнсоўным прыгнечанні, аб пакутлівым беспрасветным існаванні пролетарскага дзіцяці, якое знаходзіцца ў атмасферы невуцтва, грубасці, бескультур'я, мардабою, здзекаў і дзікасці.

Гэтыя аповесці ўсяляюць агіду да ўлады грошай, прагнасці, дэспатызму, да звярыных уласніцкіх інстынктаў і іншых атрыбутаў зоалагічнага мяшчанскага побыту, назаўсёды адышоўшых у мінулае ў краіне перамогшага пролетарыята. Вучні пранікаюцца гарачым спачуваннем да абяздоленых людзей, ахвяр капіталістычнага ладу.

У сёмым класе вывучаюцца такія надзвычайныя творы, як «Челкаш», «Песня о соколе», «Буревестник» і «Мать». Тут вучні наглядна пераконваюцца ў сіле і дзейнасці горкаўскага пратэсту, накіраванага супроць самадзяржаўнага прыгнёту і ўсяго эксплаататарскага парадку ў цэлым.

Рэзкім адмаўленнем беспрынцыпнай мяшчанскай маралі, уласніцкага інстынкту, самых асноў капіталістычнага драпежніцтва і нажывы прасякнута апавяданне «Челкаш». У асобе прагнага карысталюбца Гаўрылы пісьменнік геніяльна абагульняе тыповыя рысы абывацеля, поўнасцю захопленага клопатамі аб накапленні, гатовага цаной любога ўгодніцтва, злачынства і г. д. выйсці «у людзі». Наколькі вышэй гэтага прагнага мярзаўца басяк-люмпен Грышка Чэлкаш!

— Глядзіце, — як-бы гаворыць нам Горкі ў гэтым апавяданні, — нават валацуга, гуляка і злодзей, які знаходзіцца на самым «дне» тагочаснага грамадства, з'яўляецца больш моцнай, благароднай, адважнай істотай (не гаворачы ўжо аб свядомым пролетарыі-працоўным) у параўнанні з Гаўрыламі, растучымі «рыцарамі» нажывы, драпежнікамі і шкурнікамі.

«Песня о соколе» і «Буревестник»— выдатныя па сваёй форме і глыбокаму ідэйнаму зместу творы, выяўляюць веліч горкаўскага генія яшчэ на раннім этапе яго творчасці (1895 — 1901). З надзвычайным дарам прадбачання мастак адгукаецца ў іх на вызваленчы рух пролетарыята, упэўненага ў блізкасці і непазбежнасці сваёй перамогі над рэакцыяй, не гледзячы на панічныя крыкі, палахлівасць, сабатаж і супроцьдзеянне ўсіх «вужоў», «пінгвінаў», «чаек», «гагар» — ліберал аў, апартуністаў, абывацеляў і здраднікаў рэволюцыйнай справе.

Горкаўская сімволіка ў «Песне о соколе» і «Буревестнике» — канкрэтная, завостраная і жыццёвая ў адрозненне, скажам, ад поўмістычных, «неземных», далёкіх ад рэальнай сапраўднасці вобразаў — сімвалаў Бальманта, Салагуба, ранняга Брусава і другіх мастакоў- «дэкадэнтаў» 90-х год мінулага стагоддзя і пачатку бягучага стагоддзя.

Акрамя якаснай своеасаблівасці сімволікі Горкага, якая карэнным чынам адрознівалася ад сімволікі буржуазных і дваранскіх пісьменнікаў, трэба падкрэсліць таксама характэрную асаблівасць горкаўскага рамантызма канца 90-х і пачатку 900-х год. Адрозніваючыся рэволюцыйным характарам (заклік да барацьбы — да паўстання за інтарэсы народа), гэты рамантызм абапіраецца на дасканалае веданне аўтарам соцыяльнай рэчаіснасці і законаў яе развіцця, на светапогляд найбольш перадавога прагрэсіўнага класа — будаўніка соцыялізма.

З вялікай увагай вывучаецца ў школе раман «Мать», які дае рэалістычныя высокамастацкія карціны гераічнай барацьбы рабочага класа за нізвяржэнне самаўладства. Назаўсёды запамінаюцца праўдзівыя, яркія незабыўныя вобразы Паўла і яго сяброў, Нілаўны і іншых барацьбітоў за рабочую справу, цалкам адданых інтарэсам рэволюцыі.

Асобая заслуга аўтара «Мать» у тым, што яго героі дадзены не гатовымі, ужо раней сфарміраваўшыміся рэволюцыянерамі, а паказаны ў працэсе развіцця іх класавай свядомасці. Чытач наглядна адчувае рост раней адсталых і забітых колаў працоўных, ператварэнне іх у свядомых перадавых людзей, якія аддаюць сваё жыццё рэволюцыйнай справе.

У праграме дзесятага класа Горкі прадстаўлен такімі творамі, як «Коновалов», «Старуха Изергиль», «На дне» і «Дело Артамоновых». Цэнтральнае месца тут займае раман «Дело Артамоновых» — неперераўзыйдзеная па свайму замыслу і рэалізацыі карціна ўзнікнення, развіцця і падзення рускай буржуазіі. Раман з'яўляецца пераканаўчай ілюстрацыяй да ленінскага вучэння аб развіцці капіталізма ў Расіі, немінучасці яго загнівання і краху на пэўнай ступені гістарычнага працэсу.

У школьнай праграме не знайшлі сабе месца астатнія шэдэўры горкаўскай творчасці, якія трэба ведаць вучнёўскай моладзі. Сюды адносяцца, раней за ўсё, такія рэчы, як «Мещане», «Враги», «Фома Гордеев», «Городок Окуров», «Егор Булычов», «Жизнь Клима Самгина» і рад апавяданняў аб жыцці працоўнага чалавека ў капіталістычным грамадстве. Гэтыя творы трэба рэкамендаваць прачытаць вучням у парадку па-закласнага чытання, якое павінна праходзіць пад кантролем настаўніка, з абмеркаваннем прачытаных кніг на занятках літаратурнага гуртка.

Нарэшце, выключна важным з'яўляецца азнаямленне вучняў і студэнтаў з крытычнымі работамі і гісторыка-літаратурнымі выказваннямі Горкага (даклад на першым Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў. «Аб Пушкіне», «Як я вучыўся пісаць» і г. д.). З вялікай цікавасцю прачытаюць вучні выдатны нарыс Горкага аб Леніне, а таксама ўспаміны яго аб пісьменніках — Талстым, Чэхаве і інш.

Да гэтага часу горкаўская літаратурная спадчына недастаткова распрацавана ў нашай школе. Роля Горкага як асновапаложніка і класіка соцыялістычнага рэалізма, перадавога змагара з фашызмам і ваеннай небяспекай, выхавальніка кадраў совецкіх пісьменнікаў, ініцыятара барацьбы за ачыстку літаратурнай мовы, за ідэйна - мастацкі рост «інжынераў чалавечых душ» і г. д. яшчэ не асведамлена як трэба чытаючай моладдзю.

70-годдзе з дня нараджэння Горкага, зладзейска ўсмерчанага трацкісцка - бухарынскай бандай наймітаў фашызма, павінна мабілізаваць совецкае настаўніцтва на больш глыбокае вывучэнне горкаўскай творчасці і скарыстанне яе для комуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

І. ЗЕЛЬЦЭР.

УЗМАЦНЯЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

Ворагі народа, якія доўгі час арудвалі на фронце літаратуры, прыклалі сваю брудную руку і да комсамольскай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Яны імкнуліся трымаць пісьменніцкую моладзь пад сваім варожым уплывам, заражалі яе сваёй варожай ідэалогіяй, калечылі маладыя дараванні, спайваючы і разбэшчваючы іх фізічна і маральна.

Гэта ім было тым лягчэй рабіць, што на чале комсамольскай арганізацыі стаяў хітра замаскаваны вораг народа.

Вярхушка галаварэзаў, якія пралезлі ў комсамольскую арганізацыю, была выкрыта органамі совецкай разведкі. Задача заключалася ў тым, каб канчаткова ачысціць арганізацыю ад ворагаў і іх пасобнікаў.

Ворагі народа, якія акапаліся на кіруючых пастах у ЦК ЛКСМБ, рашылі «аздаравіць» комсамольскую арганізацыю ССПБ, што выявілася ў іх стараннях папростаму ліквідаваць яе, разагнаць. Два тыдні запар ворагі цягалі ўвесь комсамольскі калектыў на допыты і следствы. А кіраўніцтва комсамольскай арганізацыі ССПБ, у прыватнасці тагочасны сакратар камітэта тав. Есакоў, сустрэла ўсё гэта з разгубленасцю і сляпой пакорай.

Знайшліся ў арганізацыі людзі, якія разражаліся громападобнымі прамовамі аб пільнасці наогул і не бачылі сапраўдных ворагаў. Мальцінскі, які пазней сам быў выключан з радоў ЛКСМБ, займаўся адшуканнем неіснуючых падстаў, каб «западозрыць» як можна больш комсамольцаў у сувязях з ворагамі народа. Толькі цяпер, пасля рашэнняў пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК ВЛКСМ стала вядома, чаго дабіваліся гэтыя людзі, бароначы сваю ўласную шкуру.

У рашэннях V пленума ЦК ВЛКСМ сказана: «Большэвіцкая пільнасць, як вучыць нас комуністычная партыя, заключаецца ў тым, каб умець выкрываць ворагаў, як-бы яны ні маскіраваліся, як-бы ні былі выкрутлівы і хітры, а не ў тым, каб без разбору, у мэтах гнілой перастрахоўкі выключаць сотні комсамольцаў з радоў ВЛКСМ. Усе арганізацыі комсамола абавязаны праяўляць асцярожнасць і таварыскія клопаты пры вырашэнні пытанняў аб выключэнні з комсамола альбо аб аднаўленні комсамольцаў у іх правах».

Такая неасцярожнасць і бестурботнасць мела месца пры разборы спраў нашай комсамольскай арганізацыі.

Стаўка ворагаў народа на роспуск комсамольскай арганізацыі пісьменнікаў біта. Выкрыўшы і выгнаўшы з сваёй арганізацыі бандытаў пяра і фашысцкіх «калялітаратараў», комсамольскі камітэт ССПБ давёў, што ён можа працаваць, расці і дапамагаць сваім членам ствараць соцыялістычную літаратуру. У гістарычныя дні падрыхтоўкі і выбараў у Вярхоўны Совет СССР комсамольцы-пісьменнікі праявілі нябывалую палітычную і творчую актыўнасць. Брыгады маладых паэтаў і пісьменнікаў выступалі з чыткай сваіх твораў на шасці выбарчых участках гор. Менска. Маладыя паэты і пісьменнікі напісалі рад вершаў і нарысаў пра народных пасланцоў у сталінскі парламент нашай соцыялістычнай дзяржавы. Лепшыя свае пачуцці і думы маладыя работнікі літаратуры разам з усім совецкім народам аддалі першаму ўсенароднаму дэпутату ў Вярхоўны Совет Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну, жалезнаму палкаводцу соцыялістычнай арміі Кліму Варашылаву. Вечар, прысвечаны дэпутату ў Вярхоўны Совет ад Менска Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву, праведзен у Менскім ваенным вучылішчы імя Калініна. Паэты-комсамольцы скарысталі ў перадвыбарчай агітацыі мастацкае слова—вершаваны плакат, частушку, якія так шырока прымяняў у сваіх работах лепшы паэт нашай эпохі Уладзімір Маякоўскі.

Выступленні нашай моладзі перад выбаршчыкамі з'явіліся творчымі справаздачамі як саміх паэтаў, так і ўсёй комсамольскай арганізацыі.

Сама тэма пільнасці, бязлітаснасці да ворагаў стала ўлюбёнай, кроўнай тэмаю маладых пісьменнікаў і паэтаў. Паэт-комсамолец Аркадзь Куляшоў працуе зараз над паэмай аб Заходняй граніцы. Паэтэса-комсамолка Эдзі Агняцвет напісала паэму пра вернага сына народа, жалезнага чэкіста Фелікса Дзяржынскага. Вершы аб Чырвонай Арміі, аб пагранічніках напісалі паэты Ліўшыц, Астрэйка, Груб'ян.

Але, каб поўнасцю ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў комсамольскай арганізацыі пісьменнікаў, адной творчай актыўнасці мала. Дамініруючую ролю павінна адыграць ідэйна-палітычнае выхаванне маладых літаратараў. Глыбокае, усебаковае і сістэматычнае вывучэнне твораў Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна — гэтых скарбніц сусветнай культуры, адшліфоўвае светапогляд маладога паэта і пісьменніка, арганізуе яго на барацьбу з ворагамі. Комсамольцы-пісьменнікі яшчэ слаба вывучаюць творы класікаў марксізма-ленінізма. Палітычныя заняткі ў арганізацыі праходзяць пасіўна, вучоба комсамольцаў зрываецца. Вінаваты ў гэтым як бюро камітэта, так і прапагандыст тав. Крывіца.

Набліжаюцца выбары ў Вярхоўны Совет нашай рэспублікі. Да гэтага дня рыхтуецца ўся ордэнаносная Беларусь, увесь беларускі народ. Перад намі стаіць пачэсная і адказная задача — агітаваць за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР мастацкім словам. Кожнаму паэту і пісьменніку тут прадастаўляюцца шырокія магчымасці, ініцыятыва, пачын.

Таварыш Сталін у сваім адказе на пісьмо комсамольца Іванова яшчэ раз напомніў аб большэвіцкай пільнасці, указаў, што капіталістычнае абкружэнне застаецца пакуль-што фактам. Вывад з гэтага ясны — узмацняць нянавісць да ворагаў, умець іх распазнаваць і знішчаць. Дапамагаць нашым слаўным чэкістам у выкарчоўванні трацкісцка-бухарынскай нечысці, агентаў фашызма — задача краіны, задача наша — маладых літаратараў Совецкай Беларусі.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ.
Сакратар комсамольскага камітэта ССПБ.

Радыёперадачы, прысвечаныя Горкаму

Белрадыёкамітэт адзначае 70-годдзе з дня нараджэння вялікага пролетарскага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага радам літаратурных перадач.

Артыстамі Бравар[с]кай, Палонскай, Кудраўцавым і інш. будуць прачытаны па радыё вядомыя апавяданні Горкага—«Дзяўчына і смерць», «Макар Чудра» (на яўрэйскай мове), урывак з аповесці «Мае універсітэты», «Песня аб сокале», «Песня аб буравесніку» і інш.

27 сакавіка спецыяльна для хатніх гаспадынь будзе праведзена гутарка на тэму «Вялікі пролетарскі пісьменнік Аляксей Максімавіч Горкі».

МАСТАКІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

(Усеармейская юбілейная мастацкая выстаўка)

Велізарныя светлыя аванзалы і файе Цэнтральнага Дома РСЧА імя М. В. Фрунзе запоўнены сотнямі твораў жывапісу, графікі, скульптуры. Творчы актыў мастакоў-байцоў РСЧА адчытваецца перад совецкай грамадскасцю ў сваёй рабоце, паказвае свае поспехі і дасягненні. Выстаўлена звыш 700 экспанатаў. Аўтары выстаўленых работ— байцы, камандзіры, жонкі кампалітскладу. Іх 500 чалавек — атрад, які спалучае ў штодзённай баявой вучобе кісць мастака з вінтоўкай.

Працоўнае насельніцтва Масквы — штодзённы госць на выстаўцы. Патокі працоўных з раніцы да вечара падоўгу і ўважліва аглядаюць яе.

Байца-мастака цікавяць усе жанры выяўленчага мастацтва. Але ў большасці сваёй выстаўка насычана абаронным і абарона-батальным жывапісам, прычым вялікая ўвага ўдзелена грамадзянскай вайне, яе героіцы, мужнасці байцоў і камандзіраў. Не малое месца займае партрэтны жанр, прадстаўлены ў большасці ў алоўку і гушы. Пейзаж і натурморт займаюць на выстаўцы таксама значнае месца.

Вось два добрых дзесяткі карцін бясспрэчна адоранага, здольнага мастака — лейтэнанта Дамашчэнкі. Веданне паказваемых сюжэтаў, смеласць рысунка, рэалістычнае вырашэнне кампазіцыі ўласцівы гэтаму маладому майстру. Яго карціны «Шальная куля», «11 армія», «Гібель корпуса Слашчова», «Разгром карнілаўцаў», «Адступленне белых з Растова», «Мая радзіма» і іншыя маглі-б упрыгожыць усякую выстаўку мастакоў-прафесіяналаў. Наведвальнікі падоўгу стаяць ля работ Дамашчэнкі.

Добра прадстаўлены пагранічнікі. Праглядаючы карціны адважных чэкістаў адчуваеш, як любяць яны сваю радзіму, за які высокі гонар лічаць яны баявую службу па ахове граніц сваёй вялікай соцыялістычнай дзяржавы. Іх работы пакідаюць вялікае ўражанне. Вялікае палатно лейтэнанта Янчука «Подвіг пагранічніка Гаўрыкава», карціны чырвонаармейцаў Сафронава і Меншыкава — «Эпізод з пагранічнай баявой службы», Вішнякова — «Подвіг капітана Агеева» і Леонцьева — «Трывога на заставе» — выразныя, адны з лепшых на выстаўцы. Раздзел пагранічнікаў завяршаюць выдатна выкананыя вышыўкі жонак камандзіраў пагранічных войск.

Надзвычайную цікавасць уяўляюць работы мастацкай студыі імя Грэкава. Адчуваецца, што ў студыі праводзіцца сістэматычная работа з байцом-мастаком. Рад аўтароў паказаны ў іх паслядоўным росце. Лепшыя работы студыі: «Данясенне павінна быць дастаўлена ў тэрмін» — акварэль чырвонаармейца Труніна, «Клінок» — акварэль чырвонаармейца Прагіна, «Конь»—карціна маслам Зеліхмана, замалёўкі з ваеннага быту чырвонаармейца Перавышына, эцюды і натурморты чырвонаармейца Рэгулярнага, «Сумесныя дзеянні конніцы з авіяцыяй» — работа чырвонаармейца Васільева.

Надзвычай цікавая серыя скульптурных работ жонкі камандзіра Перапёлкінай «Камандзір-лётчык» і рад эпізодаў з грамадзянскай вайны.

Чырвонаармеец Ткачоў выставіў цікавую серыю сваіх пейзажаў, зробленых у лірычных тонах.

Беларуская ваенная акруга прадстаўлена вялікай колькасцю работ байцоў тт. Сяргеева, Маслава, Аляксеева, Шчукіна, Ерафеева, Арпета і інш. Работы байцоў Беларускай ваеннай акругі — Літароўскага «У разведцы», Паздзнякова «Палітзаняткі», Івінскага (разьба па дрэву) «Баявы дазор» — у ліку лепшых экспанатаў выстаўкі.

Магутная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, ахоўваючы недатыкальнасць граніц нашай радзімы, стаючы на варце непарушных асноў шчаслівага сталінскага жыцця, здолела выхаваць у сваіх радах сотні, тысячы таленавітых людзей. Усеармейская выстаўка чырвонаармейцаў-мастакоў, прысвечаная слаўнай XX гадавіне РСЧА,— яркае сведчанне гэтаму.

Чырвонаармейская выстаўка ў Маскве — багацейшы ўклад у скарбніцу выяўленчых мастацтваў краіны Советаў.

В. МУРАТ.



З выстаўкі мастакоў Чырвонай Арміі. Карціна малодшага лейтэнанта М. Н. Дамашчэнкі.

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ



Кіностудыя «Совецкая Беларусь» рыхтуе выпуск чэхаўскай праграмы— кароткаметражных фільмаў па творах А. П. Чэхава.

Закончана здымка фільма паводле апавядання «Налім» (рэжысёр С. Сплашноў).

Зараз экранізуецца вадэвіль «Мядзьведзь» (рэжысёр Аненскі). У галоўных ролях здымаюцца заслужаны артыст рэспублікі Жараў і заслужаная артыстка рэспублікі Андроўская. Музыку піша кампазітар Жэлабінскі.

На здымку кадр з фільма «Мядзьведзь».

Якуб КОЛАС

ЧУВАЦЬ ВЯСНА

Не сыйшлі яшчэ з нізіны
Роспісы зімы,
Скуты холадам даліны,
Луг ляжыць нямы.

Але зрок нябёс яснее,
Больш і больш святла,
Жыватворчая надзея
Землю абняла.

Белы пух атрэслі з шапак
Хвойнікі, ляскі,
А іх заціпкі, бы запек,
Туляць дол, пяскі.

Лашчыць сонца твар узгоркаў,
Сушыць след іх слёз,
Што струменяцца разоркай
Да знямелых лоз.

Па-над лесам ходзіць шолам,
Хмельны зоў вясны,
І разліты навакола
Жыцця мары-сны.

Весялей у вочы свету
Зорацць стрэхі хат.
Эй, калгаснік: помні лета,
Варушыся, брат!

У надзем'і, як жалейка,
Сонцу ў лад і ў тон
Сыпле пташка-чарадзейка
Першых песень звон.

1938.

ТВОРЫ ГОРКАГА НА БЕЛАРУСКАЙ І ЯЎРЭЙСКАЙ МОВАХ

Творы Максіма Горкага — любімага пісьменніка працоўных — перакладзены на ўсе мовы народаў СССР і амаль на ўсе мовы свету.

У Белдзяржвыдавецтве праводзіцца вялікая работа па перакладу і выданню твораў Горкага на беларускай і яўрэйскай мовах.

У 1935 годзе Белдзяржвыдавецтва прыступіла да выдання поўнага збору твораў Горкага на беларускай мове. Абвешчаная падпіска ў кароткі тэрмін дала звыш 5 тысяч падпісчыкаў.

Да 1938 года з 25 томаў поўнага збору твораў Горкага выйшла з друку 8 томаў. У друку знаходзіцца 11 томаў і рыхтуюцца да друку астатнія 6. Паводле плана Белдзяржвыдавецтва ўсе томы Горкага будуць здадзены ў друк у бягучым годзе.

Адначасова выбраныя творы Горкага выдаюцца паасобнымі кнігамі. Выйшлі з друку на беларускай мове ў дзіцячай серыі «9 студзеня» і «Дзед Архіп і Лёнька». Знаходзіцца ў друку «Маці» на беларускай мове. Адначасова рыхтуецца да друку на беларускай мове двухтомнік выбраных твораў Горкага, адпаведны двухтомніку на рускай мове ў выданні Выдавецтва мастацкай літаратуры (Масква).

У бліжэйшы час пачнецца друкаванне двух томаў выбраных апавяданняў Горкага на яўрэйскай мове тыражом у 2 тысячы экземпляраў. Здадзены ў друк на яўрэйскай мове «Дзяцінства» — у школьнай серыі і «Нараджэнне чалавека» — у масавай серыі. Рыхтуецца да друку на яўрэйскай мове апавяданне «Гледачы» у бібліятэчнай серыі «Ля кастра».

Некаторыя творы Горкага выдаюцца Белдзяржвыдавецтвам на рускай мове. Так, гэтымі днямі выйшла з друку «Маці» на рускай мове.

П'ЕСЫ А. М. ГОРКАГА Ў ТЭАТРАХ БССР

Тэатры БССР адзначаюць 70-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка і драматурга Аляксея Максімавіча Горкага пастаноўкай раду яго драматургічных твораў.

Белдзяржтэатр у Менску пакажа п'есу «Апошнія» ў пастаноўцы рэжысёра Зорава. Спектакль карыстаецца ў працоўных сталіцы вялікім поспехам.

Яўрэйскі дзяржаўны тэатр пакажа спектакль «Фальшывая манета» у пастаноўцы Галаўчынера.

Рускі тэатр БССР у Магілеве пакажа «Дзеці сонца» у пастаноўцы Данаці.

Віцебскі драмтэатр рыхтуе пастаноўку п'есы «Мяшчане».

У рэпертуарныя планы тэатраў БССР уключаны да пастаноўкі ў 1938 годзе п'есы А. М. Горкага: «На дне» (Беларускі дзярждрамтэатр) і «Васса Жэлязнова» (Яўрэйскі тэатр БССР).

Міх. Беккер

МАКСІМ ГОРКІ І МАЛАДЫЯ ПІСЬМЕННІКІ

«Вучыцца патрэбна, таварышы. Заўсёды, кожны дзень, усё жыццё вучыцца». М. ГОРКІ

У прадмове да першага зборніка пролетарскіх пісьменнікаў Горкі пісаў:

«Я моцна ўпэўнены, што пролетарыят можа стварыць сваю мастацкую літаратуру, як стварыў з вялікай цяжкасцю і велізарнымі афярамі сваю штодзённую прэсу».

Так мог пісаць толькі Горкі, празорлівы мастак, які глыбока верыў у творчыя сілы рабочага класа.

Адносіны Горкага да маладых пролетарскіх пісьменнікаў вельмі ярка праявіліся ў артыкуле «Аб пісьменніках-самавучках». У пробліcках рабочай літаратуры ён бачыў зарніцы новай гістарычнай эры. Ён ведаў: далёкая ад дасканаласці маладая літаратура будзе развівацца па меры росту пролетарыята, як «класа для сябе».

Асаблівай увагі заслугоўвае тое месца артыкула, у якім Горкі асуджае інтэлігенцыю за яе танненькі скепсіс і раіць ёй бліжэй пазнаёміцца з творчасцю беларускіх пісьменнікаў. Горкі змяшчае ў артыкуле свой выдатны пераклад верша Я. Купалы, наглядна дэманструючы творчыя магчымасці забітага і прыгнечанага пры царызме народа.

Гэтым самым Горкі біў па нацыянальнай абмежаванасці і спрыяў аб'яднанню пісьменнікаў рэволюцыйнай мыслі ў моцную сям'ю.

Разам з тым Горкаму былі чужды саладжавыя інтэлігенцкія захапленні. У зборніку пролетарскіх пісьменнікаў ён бачыў скромны пачатак, «адзін з першых крокаў пролетарыята да стварэння сваёй мастацкай літаратуры». Горкі не зніжаўся да ўзроўню пісьменніка-«сераднячка», не раўняўся на так званы «другі гатунак», ён стаяў за ідэйна і мастацка поўнакаштоўную літаратуру, вартую пролетарыята.

Значэнне Горкага, як выхавацеля літаратурных кадраў, стала асабліва відавочным пасля Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Горкі выцягваў з невядомасці пачынаючых пісьменнікаў і сваімі беражлівымі адносінамі дапамагаў ім станавіцца на ногі. Няма, здаецца, ні аднаго буйнага совецкага пісьменніка, які не карыстаўся падтрымкай Горкага, які ў той ці іншай меры не быў абавязаны яму сваім творчым ростам.

«Саррэнтаўскі перыяд» характарызуецца ўсё ўзрастаючай увагай Горкага да пачынаючых пісьменнікаў. З-пад яго пяра выходзяць сотні пісьмаў, адрасаваных маладым літаратарам. Большай часткай гэта суровы разгляд рукапісаў, які змяшчае ў сабе канкрэтныя і дзелавыя ўказанні. Не абмяжоўваючыся перапіскай, ён гаварыў з трыбуны друку аб адказнасці ўсёй краіны перад маладымі пісьменнікамі, якім патрэбна сістэматычная дапамога.

«Неабходна больш увагі да маладых літаратараў, больш клопатаў пра іх».

Годы 1928 — 1936 — гэта кульмінацыйны пункт у рабоце Горкага з маладымі. Горкі ставіў перад намі на ўвесь рост задачу выхавання майстроў культуры, бачачы ў гэтым «наказ эпохі», свяшчэнны абавязак рабочага класа. Пры гэтым Горкі не заставаўся на глебе «дэкларацыі». Ён сам дзейсна кіраваў ростам маладых, кіраваў іншы раз і арганізацыйна. Яго артыкулы па пытаннях літаратуры даюць найбагацейшы матэрыял для пастаноўкі справы выхавання маладога пісьменніка ва ўмовах соцыялістычнай культуры.

Асноўнае пытанне, якое Горкі ставіў перад маладымі, — гэта пытанне аб сувязі мастака з эпохай, аб яго адносінах да рэчаіснасці. Дзе і калі-б Горкі ні выступаў, ён ваяваў з ганебна-роўнадушнымі адносінамі да новага жыцця і заклікаў уважліва вывучаць матэрыял мастацтва — новую рэчаіснасць. Ён дэманстрыраваў перад пачынаючымі самыя рознастайныя бакі новай рэчаіснасці і ўказваў на закладзеныя ў іх паэтычныя магчымасці. Ён заўсёды падкрэсліваў, што асноўная ўвага павінна быць звернута на паказ **шматгранных дасягненняў соцыялізма**, якія мы часам яшчэ дрэнна ведаем. У прыватнасці, Горкі не раз указваў, што маладыя пісьменнікі дрэнна адчуваюць паэзію працы і параджаемых ёю новых адносін. Пры гэтым Горкі праводзіў рэзкую грань паміж новай тэматыкай, узятай, **па сутнасці,** грунтоўна і глыбока, і тэматыкай, зразуметай **вонкава,** фармальна.

Горкі змагаўся з бяскрылым бытавізмам і беспрынцыпным апісальніцтвам, супроцьстаўляючы ім літаратуру вялікіх абагульненняў, метад соцыялістычнага рэалізма. «Мала паказаць сутнае, — гаварыў ён у «Гутарцы з маладымі», — неабходна памятаць аб **жаданым і магчымым, неабходна тыпізацыя».**

Паставіўшы перад маладымі задачу ўсебаковага і глыбокага паказу рэчаіснасці, Горкі заклікаў да ўпартай і ўважлівай работы над словам. Яго патрабаванні ў галіне стылю замацаваны не толькі ў артыкулах, але і ў рукапісах, праўленых яго рукой.

Пачыналася з «дробязей». Горкі падкрэсліваў словы, якія часта паўтараліся, склады, немілагучныя сказы. «Часта какаеце» — жартаўліва піша ён аднаму аўтару.

Не любіць Горкі дзеясловўных прыметнікаў і дзеепрыслоўяў з канчаткам на «ўшы». «На першай старонцы апавядання «ўшы» поўзаюць у вялікай колькасці: прыбыўшую, прапрацаваўшую, гаварыўшых. Зусім можна абысціся без насякомых».

На шматлікіх прыкладах Горкі паказаў шкоднасць літаратуршчыны, якая праяўляецца ў падрумяньванні слоў, злоўжыванні штампамі, літаратурнай прылізанасці, таннай утончанасці і напуманасці вобразаў.

Пачынаючы пісаў:

«Набліжалася раніца. Ружовыя лентачкі цягнуліся на небасхіле. Шыла ляжаў, абапёршыся на локаць і драмаў. Лес, які абуджаўся, сваёй ціхай, але шматгучнай песняй закалыхваў яго».

Горкі піша з гэтага повада:

«Вось такія папяровыя кветачкі і псуюць сур'ёзную справу. Людзі ў небяспечным становішчы, а расказчык гаворыць аб ружовых лентачках».

Горкі адзначае рад выпадкаў, калі літаратуршчына праяўляецца «кваліфікавана», ва ўскладненым і капрызным узоры, у завумнасці мовы. Але тым больш шкодная, больш антымастацкая яна.

Праз праўку Горкага праходзіць чырвонай рысай патрабаванне яснасці, дакладнасці, зразумеласці і прастаты. Малады Пагодзін пісаў: «Стаіць ружовая рань». Горкі заўважае: «Час не стаіць». Аўтар піша: «Смех забівае ноздры, вочы, рот». Горкі ў неразуменні: «Я не разумею, як смех можа забіваць вочы, ноздры, рот. Смех — не пыл».

Не ўхваляў Горкі прыстрасця да мясцовых гаворак і няўмеранай словатворчасці, за якімі хаваецца **безадказнасць і непавага да чытача.** Барацьба за ачышчэнне мовы ад паразітычнага хламу, — за яе даступнасць, яснасць, чыстату, народнасць, — разумелася ім як задача вялікага **дзяржаўнага значэння.**

«Вы пішаце для мільёнаў, і гэтую акалічнасць не трэба выпускаць з-пад увагі. Гэта абавязвае вас да строгай работы, да сумленных адносін да слова, да яснасці, да ўсіх тых прыёмаў, з дапамогаю якіх вы найбольш дакладна перадасцё ваш вопыт, вашы ўражанні шматмільённаму чытачу».

Горкі, як ніхто, паставіў перад маладымі літаратарамі пытанні вучобы і **авалодання культурай.** Ён ніколі не замыкаў пісьменнікаў у рамкі літаратурнай вучобы. Ён неаднаразова гаварыў, што пісьменнік павінен ведаць многае, калі не ўсё.

«Не ведаючы гісторыі культуры, немагчыма быць культурным чалавекам, не ведаючы мінулага, немагчыма зразумець сапраўдны сэнс сучаснага і мэты будучага», — гаварыў ён.

Зразумела, Горкі не мог не гаварыць аб спецыфічна важнай для пісьменніка галіне ведаў, аб літаратурнай вучобе. Дзе толькі ўяўлялася магчымым і патрэбным, ён выступаў супроць жрацоў мастацтва, якія напускаюць ідэалістычны туман на работу пісьменніка. Асноўны сэнс яго артыкулаў, прысвечаных раместву пісьменніка, можа быць сфармуліраваны так: літаратура не храм, а майстэрня; пісьменнік у ёй работнік.

«Маладыя літаратары яўна недаацэньваюць значэнне ведаў. Яны, як быццам, занадта спадзяюцца на натхненне, але мне здаецца, што натхненне памылкова лічаць узбуджальнікам работы, напэўна яно паяўляецца ўжо ў працэсе паспяховай работы, як вынік яе, як пачуццё асалоды ёю».

Вучыцца ў класікаў! Такі лейтматыў артыкулаў Горкага. Вучыцца абагульненням і мастацкаму майстэрству.

«Яшчэ горш тое, што Есеніна вы ставіце вышэй за Пушкіна і Лермантава. Гэта — ужо зусім скандал», — піша ён пачынаючаму паэту.

У Талстога можна навучыцца... пластыцы, здзіўляючай рэльефнасці паказу.

Калі яго чытаеш, дык атрымліваецца адчуванне як-бы фізічнага быцця яго герояў, да такой ступені лоўка ў яго вытачан вобраз: нібы стаіць перад вамі, вось так і хочацца пальцам крануць.

Вось гэта майстэрства: у яго, напрыклад, адна старонка дзівосная. Вельмі цяжка перадаць рух у прасторы словамі. Хаджы Мурат са сваімі нукерамі—ад'ютантамі—едзе па цясніне. Над цяснінай — неба, як рака. У небе зоркі. Зоркі перамяшчаюцца ў блакітнай рацэ ў адносінах да выгібу цясніны. І гэтым самым ён перадаў, што людзі сапраўды едуць».

Як вядома, Горкі намеціў праграму вучобы маладога пісьменніка і з неаслабнай энергіяй працаваў над яе ажыццяўленнем. Ён рэдагаваў «Библиотеку поэта», «Историю молодого человека», «Литературную учебу», стварыў вячэрні літаратурны універсітэт і ўпарадкаваў работу літаратурных кансультацый.

З вялікай сілай паставіў Горкі пытанне аб тыпе маладога пісьменніка, аб яго соцыяльным і маральным абліччы. Адмоўныя з'явы літаратурнага асяроддзя знайшлі ў яго асобе непрымірымага выкрывальніка.

З сапраўднай страснасцю Горкі выкрывае мяшчанскі індывідуалізм, які праяўляўся ў напляваце льскіх адносінах да калектыва. Малады пісьменнік, непамерна ўзвялічаны крытыкай, адчувае «галавакружэнне ад поспехаў» і пачынае няцвёрда ступаць па зямлі.

У такога малайца пачынаюць выпрацоўвацца манеры і павадкі літаратурнага Ціт-Цітыча («што хачу, тое раблю»). «Праслаўлены» засвойвае няхітрую метадалогію зарваўшагася літаратара: выпівае «для натхнення», скандаліць, дэбашырыць, расказвае пошлыя антысовецкія анекдоты. Горкі зусім правільна заўважае, што ад такога хуліганства «да фашызма адлегласць карацей за вараб'ёў нос». Пацвярджэннем гэтаму — агідная практыка Васільевых, Карнілавых і іншых літаратараў, якіх грамадскасць даўно выкрыла, як ворагаў народа.

Моцна дасталася ад Горкага і групаўшчыне, сэнс якой заключаецца ў супроцьстаўленні інтарэсаў кучкі літаратараў інтарэсам ўсёй совецкай літаратуры, у распальванні склок і звадак, прыкрываемых шырмай «прынцыповасці».

***

Вялікія перспектывы адкрыты перад кожным пачынаючым пісьменнікам, які жадае сур'ёзна працаваць у літаратуры. Для гэтага трэба па-горкаўску страсна любіць мастацкае слова. Трэба па-горкаўску паважаць чытача і адчуваць перад ім адказнасць. Па-горкаўску трэба прад'яўляць да сябе і да сваіх таварышоў па пяру сур'ёзныя патрабаванні, змагаючыся за літаратуру, вартую нашай эпохі.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ